Сямейная газета

Родная газета на роднай мове

# ЗВЯЗДА

Выдаецца з 9 жніўня 1917 г.

19 КАСТРЫЧНІКА 2017 г. ЧАЦВЕР №202 (28566)

БЕЛАРУСКАЯ ГАЗЕТА



**Выпіска з радзільні па-беларуску**



**Ці рыхтавацца да сямейнага жыцця са школы?**



**Чым займаецца доўла**

*ЦЫТАТА ДНЯ*



**Андрэй ХУДЫК,**
**міністр прыродных рэсурсаў і аховы навакольнага асяроддзя:**

*«Устойлівае развіццё эканомікі Беларусі немагчыма без збалансаванага выкарыстання і ўзнаўлення мінеральна-сыравінных рэсурсаў, якія з'яўляюцца асновай матэрыяльнай вытворчасці і нацыянальнай бяспекі. У сувязі з гэтым адзін з прыярытэтаў у дзейнасці міністэрства — зніжэнне залежнасці эканомікі краіны ад імпартаванай мінеральнай сыравіны і павелічэнне экспартнага патэнцыялу Беларусі шляхам паставак за мяжу прадукцыі, выробленай з выкарыстаннем уласных карысных выкапняў».*

Курсы замежных валют, устаноўленыя НБ РБ з 19.10.2017 г.

| | |
|---|---|
| Долар ЗША | 1,9585 ▼ |
| Еўра | 2,3030 ▼ |
| Рас. руб. | 0,0341 ■ |
| Укр. грыўня | 0,0741 ▲ |

ISSN 1990 - 763X

# ШКОЛЬНЫ ЛЕС



У школе вёскі Германавічы Шаркаўшчынскага раёна ўжо 47 гадоў існуе сваё — школьнае — лясніцтва, якое падпарадкоўваецца Дзісенскаму лясгасу. Вучні-лесаводы дапамагаюць лясной гаспадарцы ў навядзенні парадку на лесасеках, абгароджваюць мурашнікі і вешаюць шпакоўні, удзельнічаюць у тыднях пасадкі лесу, іх запрашаюць дапамагаць на лясгасаўскім гадавальніку. Кіруе школьным лясніцтвам эколаг, настаўнік біялогіі Марына Фёдарава. А за ўзорную працу юных ляснікоў Беларускае таварыства лесаводаў пашыла і перадало навучальнай установе дзесяць камплектаў парадпай прафесійнай формы.

На здымку: школьныя лесаводы Лізавета Філіпёнак, Сняжана Кукуць, Ангеліна Чарняўская, Карына Мядзелец, Валерый Яворскі, Уладзіслаў Бондар і Валянцін Кукуць разам з настаўніцай Марынай Фёдаравай даследуюць стагадовыя дрэвы былога панскага парку.

Анатоль КЛЯШЧУК, фота аўтара.

■ Год навукі

## АРЫГІНАЛЬНЫЯ ЛЕКІ ЦІ ДЖЭНЕРЫКІ?

**Які шлях абраць, каб не адстаць ад канкурэнтаў...**



У 2010 годзе перад фармацэўтычнай прамысловасцю была пастаўлена стратэгічная задача — да 2015 года доля айчынных прэпаратаў павінна дасягаць на ўнутраным рынку не менш за 50 працэнтаў. З тых часоў была наладжана вытворчасць 537 новых лекавых сродкаў. У Беларусі зарэгістравана зараз больш за 5 тысяч найменняў лекаў. З іх беларускіх — 32 працэнты. За чатыры гады аб'ём вытворчасці лекаў павялічыўся ў 1,5 раза, а імпарт скараціўся на 236 найменняў.

СТАР. 4

■ Наша спадчына

## ХРАМ БЕЗ ЗВАНОЎ

**Святая Варвара вярнулася ў Райцу**

Гэты храм унікальны сваім архітэктурным вобразам у выглядзе карабля, дзіўнай 200-гадовай гісторыяй існавання з амаль поўным знішчэннем, паступовым аднаўленнем і сучаснымі службамі без званоў. А яшчэ ён дагэтуль захоўвае ў сабе таямніцы: уваход у пахавальню і падземны ход у былы прычтавы дом, ці, як тут кажуць, ніжнюю царкву. Цяперашні настаяцель храма Святой велікамучаніцы Варвары айцец Аляксей ШЫШКІР стварыў тут музейнае памяшканне, батлеечны тэатр з акцёрамі-дзецьмі і арганізаваў нядзельную школу, заняткі якой часта праходзяць у яго дома.

СТАР. 13



Настаяцель храма Святой велікамучаніцы Варвары айцец Аляксей ШЫШКІР стварыў батлеечны тэатр.

## Аб ЖКГ — на высокім узроўні

**Прэзідэнт Аляксандр Лукашэнка 20 кастрычніка прыме ўдзел у пленарным пасяджэнні рэспубліканскага семінара «Аб удасканаленні і развіцці жыллёва-камунальнай гаспадаркі краіны», паведамляе прэс-служба кіраўніка дзяржавы.**

На пасяджэнні планеруецца ўсебакова разгледзець пытанні ўдасканалення і развіцця жыллёва-камунальнай гаспадаркі краіны. Размова ў тым ліку пойдзе аб рэалізацыі новых падыходаў па ўдасканаленні працы ў галіне, зніжэнні выдаткаў і павышэнні якасці абслугоўвання насельніцтва. Будзе прааналізавана і сусветная практыка арганізацыі кіравання жыллёвым фондам.

У мерапрыемстве ў Палацы Незалежнасці прымуць удзел каля 250 чалавек, у тым ліку найвышэйшыя службовыя асобы, кіраўнікі дзяржорганаў і арганізацый, прадстаўнікі мясцовых органаў дзяржкіравання.

Рэспубліканскі семінар пройдзе ў Мінску 19—20 кастрычніка. У першы дзень адбудзецца адкрыццё мерапрыемства, пройдуць практычныя заняткі, падчас якіх удзельнікі семінара змогуць азнаёміцца з вопытам арганізацыі работы па розных напрамках у сферы жыллёва-камунальнай гаспадаркі.

## Медыяцыя — шанц выйграць для ўсіх

**З дапамогай медыяцыі — працэдуры пазасудовага пагаднення бакоў — можна будзе вырашаць школьныя канфлікты і дамаўляцца па крымінальных абвінавачваннях, дзе прадугледжана нязначнае пакаранне, а падстава для пачатку справы — заява фізічнай асобы. Пакуль у Беларусі найбольш перспектыўна медыяцыя працуе ў сферы сямейных праваадносін, бо гэта тыя канфлікты, якія людзі не вельмі хочуць агучваць у судзе, аднак і паміж сабой дамовіцца не могуць, расказаў пра магчымасці развіцця медыяцыі ў краіне міністр юстыцыі Беларусі Алег СЛІЖЭЎСКІ на міжнародным семінары «Судовая медыяцыя».**

— Спосабы пазасудовага вырашэння канфліктаў існуюць даўно. Гэта і трацейскае правасуддзе, і дзейнасць былога рэспубліканскага працоўнага арбітражу, у рабоце якога назіраліся пэўныя элементы пасрэдніцтва пры вырашэнні працоўных спрэчак. Закон аб медыяцыі прыняты ў Беларусі ў 2014-м, аднак дагэтуль спектр галін, дзе яна можа прымяняцца, дастаткова вузкі, і мы працуем над яго пашырэннем, — падкрэсліў ён. — У 2018-м з дапамогай Дзіцячага фонду ААН (ЮНІСЕФ) пачнецца, напрыклад, пілотны праект па прымяненні медыяцыі ў некаторых школах.

Да 85% канфліктаў у краінах, дзе медыяцыя працуе даўно, вырашаюцца менавіта з яе дапамогай. Аднак казаць, што медыяцыя прымяняецца ў Беларусі паспяхова, яшчэ рана. У нашай прававой культуры і менталітэце вельмі вялікі ўзровень даверу да судовых рашэнняў. Наш чалавек, калі ўзнік канфлікт, павінен атрымаць судовае рашэнне, дакумент з пячаткай. Такое становішча, вядома, не падштурхоўвае людзей да мірнага вырашэння спрэчак праз медыяцыю, перакананы **Валерый МІЦКЕВІЧ, намеснік кіраўніка Адміністрацыі Прэзідэнта**:

— Заканадаўча замацоўваць прымяненне медыяцыі ў некаторых катэгорыях грамадзянскіх спраў памылкова. Наша задача — сфарміраваць у людзей гатоўнасць і патрэбнасць да прымянення, — пагадзіўся з **міністрам юстыцыі яго намеснік Мікалай СТАРАВОЙТАЎ**. — Медыяцыя — спосаб урэгулявання спрэчкі, які дае яе ўдзельнікам унікальную магчымасць не згубіць усё, а захаваць партнёрскія адносіны.

Гаворачы пра вопыт медыяцыі ў Германіі, **пасол Федэратыўнай Рэспублікі Германія ў Беларусі Петэр ДЭТМАР** падкрэсліў, што ў нашай краіне «трэба выкарыстоўваць нямецкае права з улікам нацыянальных асаблівасцяў Беларусі, а не капіраваць адзін да аднаго. Гэта станецца выйгрышным для абодвух бакоў».

**Ірына СІДАРОК.** *sidarok@zviazda.by*

### ■ Меркаванне



## Беларусь — Узбекістан: перспектывы супрацоўніцтва

**Падчас перамоў у Сочы Прэзідэнт Узбекістана Шаўкат Мірзіёеў і Прэзідэнт Беларусі Аляксандр Лукашэнка абмяняліся ідэямі аб тэмпах і перспектывах развіцця беларуска-ўзбекістанскіх адносін. Беларускі лідар таксама атрымаў запрашэнне наведаць з візітам Узбекістан у 2018 годзе. Што з сябе ўяўляе Узбекістан сёння і якія перспектывы развіцця паўнавартаснага супрацоўніцтва?**

Узбекістан з'яўляецца самай населенай краінай Цэнтральнай Азіі, больш за палову насельніцтва ўсяго рэгіёна, 33 мільёны чалавек, сканцэнтравана на яго тэрыторыі. Пры гэтым па памеры тэрыторыі Узбекістана далёка адстае ад населенага ў два разы менш Казахстана. Ён мае 448,978 км² на фоне 2 724,900 км² у Казахстана. У той жа час і наяўнай тэрыторыі хапае, каб зрабіць Узбекістан вельмі важнай краінай Цэнтральнай Азіі, у тым ліку з-за суседства з такой важнай для лёсаў рэгіёна краінай, як Афганістан.

Нельга не адзначыць і ролю Узбекістана ў справе забеспячэння рэгіянальнай бяспекі. Размешчаная на скрыжаваннях гандлёвых шляхоў дзяржава з'яўляецца жаданым маршрутам для наркагандляроў і тэрарыстаў. Больш за тое, ісламскія экстрэмісцкія групоўкі, у тым ліку «Ісламскі рух Узбекістана» (ІРУ) і «Ісламская дзяржава» (ІД) хочуць дэстабілізаваць сітуацыю ў краіне і прыйсці да ўлады. Таму ў цеснай каардынацыі з зацікаўленымі краінамі Узбекістан актыўна ажыццяўляе меры па барацьбе з гэтымі выклікамі. Ажыццяўляецца таксама эфектыўнае ўзаемадзеянне ў барацьбе з іншымі сучаснымі выклікамі, транснацыянальнай злачыннасцю, а таксама ў сферы кібербяспекі.

Нельга не падкрэсліць і значэнне Узбекістана як рэсурснай базы для развіцця рэгіёна. Узбекістан з'яўляецца адным з ключавых пастаўшчыкоў уласнага прыроднага газу для велізарнай кітайскай эканомікі і дае сваю тэрыторыю для дастаўкі прыроднай сыравіны ў Кітай з іншых краін рэгіёна. Уклад у энергетычную бяспеку КНР, вядома ж, вельмі пазітыўна ацэньваецца яе кіраўніцтвам. Гэта стварае для Узбекістана дадатковыя магчымасці па паспяховым супрацоўніцтве з Кітаем, нягледзячы на адсутнасць агульнай мяжы. У прыватнасці, у найбліжэйшыя месяцы будзе ажыццяўляцца грандыёзны праект па развіцці шаўкаводства ва Узбекістане. Кітайскія партнёры пастаўяць у краіну 10 мільёнаў саджанцаў тутаўніка трох сартоў, адпаведных кліматычным умовам Узбекістана.

Агульным фактарам для Беларусі і Узбекістана з'яўляецца адсутнасць выхаду да Сусветнага акіяна на ўласнай тэрыторыі. Гэта выклікае падобныя праблемы ў знешняй палітыцы і эканоміцы, паспяховае вырашэнне якіх важнае для нацыянальнай бяспекі абедзвюх краін і можа стаць дадатковым фактарам паспяховага ўзаемаразумення.

У сферы знешняга гандлю можна адзначыць пазітыўную тэндэнцыю апошняга года. У студзені—ліпені 2017 года таваразварот дзвюх краін сур'ёзна вырас. Экспарт склаў 43 мільёны долараў (244 працэнты ад леташняга ўзроўню), імпарт таксама вырас на 18,4 працэнта. Вядома, гэта нашмат менш пікавых значэнняў 2012—2013 гадоў, калі гадавы экспарт беларускіх тавараў даходзіў да 90—95 мільёнаў долараў, але гэта ўжо крок у правільным кірунку.

Для развіцця вытворчай кааперацыі важнай можа стацца прапанова беларускага Прэзідэнта па выкарыстанні беларускіх тэхналогій у сферы перапрацоўкі бавоўны ў таварную прадукцыю на тэрыторыі Узбекістана. Цяпер беларуская прамысловасць ужо прадстаўлена на тэрыторыі краіны. У Ташкенце функцыянуе сумеснае прадпрыемства па зборцы тэхнікі «Амкадор».

Прыемна таксама адзначыць, што ў лютым наступнага года ва Узбекістане пройдуць Дні культуры Беларусі. Гэта знак цікавасці і павагі да беларускага боку, які з'яўляецца добрай асновай для нарошчвання супрацоўніцтва па ўсіх кірунках. Пры гэтым адзначу, што культура самога Узбекістана значна паўплывала на сусветную цывілізацыю, з'яўляючыся адной з самых старажытных у Еўразіі. Бухара і Самарканд — прываблівыя аб'екты для турыстаў усяго свету, ахвотных акунуцца ў атмасферу глыбокай гісторыі, што, несумненна, паспрыяе і развіццю турызму з Беларусі. Сур'ёзныя меры па развіцці турызму ў Беларусі, прынятыя ў апошнія гады, таксама дазволяць разлічваць на сустрэчную цікавасць з Узбекістана.

Несумненны і перспектывы развіцця супрацоўніцтва ў адукацыйнай сферы. Тысячы студэнтаў з Туркменістана, якія навучаюцца ў Беларусі, павінны стаць добрай рэкламай для прыцягнення студэнтаў і з Узбекістана.

**Сяргей КІЗІМА, доктар палітычных навук, прафесар Акадэміі кіравання пры Прэзідэнце Рэспублікі Беларусь**

### ■ Парламенцкі дзённік

## На пляцоўцы Міжпарламенцкага саюза

### Наша дэлегацыя завязвае кантакты з замежнымі калегамі

**Парламентарыі Беніна зацікаўлены ў развіцці кантактаў з Нацыянальным сходам Рэспублікі Беларусь. Гаворка пра гэта ішла на сустрэчы членаў беларускай дэлегацыі з калегамі з Беніна, якая адбылася на палях 137-й Асамблеі Міжпарламенцкага саюза (МПС) у Санкт-Пецярбургу.**

Як паведамілі ў прэс-службе Палаты прадстаўнікоў, з беларускага боку ў сустрэчы ўдзельнічалі намеснік старшыні Палаты прадстаўнікоў Баляслаў Пірштук, старшыня Пастаяннай камісіі Савета Рэспублікі па міжнародных справах і нацыянальнай бяспецы Сяргей Рахманаў і намеснік старшыні Пастаяннай камісіі Палаты прадстаўнікоў па пытаннях экалогіі, прыродакарыстання і чарнобыльскай катастрофы Ала Навумчык. Парламенцкую дэлегацыю Беніна ўзначаліў старшыня Нацыянальнай асамблеі гэтай краіны Адрыен Хунгбеджы.

Парламентарыі Беніна выказалі сваю зацікаўленасць у наладжванні цесных двухбаковых адносін з Нацыянальным сходам нашай дзяржавы, адзначыўшы пры гэтым, што ўдзел у мерапрыемствах МПС з'яўляецца эфектыўным спосабам для дасягнення выніку. Баляслаў Пірштук падтрымаў гэтую ідэю і прапанаваў прапрацаваць пытанні аб магчымасці стварэння ў парламентах дзвюх краін груп дружбы, а таксама абмену візітамі па парламенцкай лініі. Асобную ўвагу Баляслаў Пірштук удзяліў развіццю ўзаемадзеяння па самым шырокім спектры пытанняў. Ён адзначыў, што Беларусь зацікаўлена ў надзейных партнёрах.

**Надзея ЮШКЕВІЧ.** *yushkevich@zviazda.by*

### ■ Ёсць пытанне

## Адвязаць рост заробкаў ад прадукцыйнасці працы

### прапануюць прафсаюзы ў асобных выпадках

**Ініцыятыва ўдасканаліць пастанову Саўміна №744 «Аб аплаце працы работнікаў» была агучана на пасяджэнні Нацыянальнага савета па працоўных і сацыяльных пытаннях. Як лічыць намеснік старшыні Федэрацыі прафсаюзаў Алена МАНКЕВІЧ, на пэўным этапе развіцця эканомікі закон выканаў сваю функцыю па стрымліванні неабгрунтаванага росту заработнай платы, а сёння ўжо часта запавольвае развіццё прадпрыемстваў і рост заробкаў.**

Спецыяліст тлумачыць, што на фактары, ад якіх залежыць выручка прадпрыемстваў, большасць добрасумленных работнікаў аб'ектыўна не могуць паўплываць у сілу сваіх службовых абавязкаў. А значыць у іх няма стымулу дасягаць максімальных вынікаў. Пастанова не ўлічвае і працэсаў мадэрнізацыі, калі для апрабацыі новых установак людзі прыняты ўжо сёння, а выхад гэтых установак на поўную моц з выпускам гатовай прадукцыі планеуецца толькі праз пару гадоў. Сезоннасць работы прадпрыемстваў, іх рэнтабельнасць таксама не прымалася да ведама.

Яшчэ адзін важны момант. Для прыватных арганізацый нормы пастановы №744 носяць рэкамендацыйны характар — гэта стварае няроўныя ўмовы аплаты працы работнікаў дзяржаўнага і недзяржаўнага сектараў эканомікі.

— Праблемныя пытанні суадносін росту прадукцыйнасці працы і заробкаў агульнага характару, а таксама пытанні пашырэння пераліку паказчыкаў, якія ўлічваюцца пры ацэнцы эфектыўнасці работы прадпрыемстваў (напрыклад, наяўнасць прыбытку і рэнтабельнасці), павінны быць вырашаны на ўзроўні самой пастановы, — адзначыла Алена Манкевіч. — Акрамя таго, з улікам занадта шырокага спектра асаблівасцяў вытворчасці прапануем даць магчымасць профільным прадпрыемствам ці канцэрнам самастойна вызначаць паказчыкі, парадак і ўмовы для разліку прадукцыйнасці працы.

**Наталля ЛУБНЕЎСКАЯ.** *lubneuskaya@zviazda.by*

## Хроніка апошніх падзей

### Міжнародны статус Кітая істотна ўзрос



Упэўненасць у гэтым выказаў старшыня КНР Сі Цзіньпін, выступаючы з дакладам на XIX з'ездзе Камуністычнай партыі Кітая, які адкрыўся ў Доме народных прадстаўнікоў у Пекіне.

Старшыня КНР адзначыў, што ўпершыню час краіна ўступіла ў новую эпоху сацыялізму з кітайскай спецыфікай. Яшчэ ў першыя гады правядзення палітыкі рэформаў і адкрытасці КПК прапанавала ісці ўласным шляхам і пабудаваць сацыялізм з кітайскай спецыфікай. З тых часоў Кітай выйшаў у сусветныя лідары ў галіне эканамічнага і навукова-тэхнічнага развіцця, а таксама па абароннай і сукупнай моцы дзяржавы.

Кітайская нацыя, якая перажыла з пачатку перыяду новай гісторыі шматлікія бедствы, цяпер устала на ногі, павысіўся ўзровень дабрабыту людзей і ўзрос эканамічны патэнцыял, падкрэсліў Сі Цзіньпін. Зараз стаіць задача пабудовы да 2020 года сярэднезаможнага грамадства, а таксама пераходу да ўсебаковага будаўніцтва мадэрнізаванай сацыялістычнай дзяржавы. «Гэта эпоха паступовага набліжэння Кітая да цэнтра міжнароднай арэны і бесперапыннага ўнясення краінай яшчэ большага ўкладу ў развіццё чалавецтва», — сказаў кітайскі лідар.

«Наша асноўная рэалія засталася нязменнай — мы па-ранейшаму знаходзімся і яшчэ працяглы час будзем знаходзіцца на пачатковай стадыі сацыялізму, застаецца нязменным і міжнародны статус Кітая як самай вялікай у свеце краіны, якая ідзе па шляху развіцця», — сказаў Сі Цзіньпін. Кітай мае намер і надалей ісці па шляху мірнага развіцця і стымуляваць стварэнне супольнасці адзінага лёсу чалавецтва.

### КС Малдовы абвінаваціў прэзідэнта ў парушэнні Канстытуцыі і прыгразіў імпічментам

Канстытуцыйны суд Малдовы ў аўторак, 17 кастрычніка, пазбавіў прэзідэнта краіны права блакіраваць прызначэнне службовых асоб, якія прапаноўваюцца кіруючай большасцю.

КС прыйшоў да высновы, што Дадон «парушыў Канстытуцыю і клятву прэзідэнта», і гэта можа стаць прычынай яго адстаўкі. Падставай для такога вердыкту стала адмова прэзідэнта падпісаць прызначэнне на пасаду міністра абароны Эўджэна Стурзы, чыю кандыдатуру вылучыла кіруючая Дэмакратычная партыя. Па рашэнні КС, цяпер подпіс прэзідэнта можа і не спатрэбіцца.

### У Гарвардзе прадказалі смяротна небяспечную ўспышку на Сонцы

Даследчыкі з Гарвардскага ўніверсітэта сцвярджаюць, што ў наступным стагоддзі на Сонцы адбудзецца выбух, які абернецца гібеллю мільёнаў жыхароў планеты.

Як паведамляе New Scientist, высновам аб непазбежным выбуху папярэднічалі шматгадовыя назіранні за Сонцам.

Ён выкліча, на думку вучоных, парушэнне ў рабоце энергетычных прадпрыемстваў, спадарожнікаў, інтэрнэту, а таксама знішчыць сістэму астуджэння атамных электрастанцый.

Пасля выбуху Сонца стане на 30% ярчэйшае, што разбурыць азонавы пласт вакол Зямлі.

■ Фінансы

# СТАЎКА РЭФІНАНСАВАННЯ «ІДЗЕ» ЎСЛЕД ЗА ІНФЛЯЦЫЯЙ

**Працэс зніжэння стаўкі рэфінансавання будзе працягвацца па меры запавольвання інфляцыі, заявіў старшыня праўлення Нацбанка Павел Калаур падчас XIV Міжнароднага форуму па банкаўскіх інфармацыйных тэхналогіях «БанкІТ'2017».**




Фота БЕЛТА.

## Даступныя крэдыты

Канкрэтныя рашэнні па зніжэнні стаўкі рэфінансавання будуць прымацца праўленнем Нацбанка ў залежнасці ад таго, як будзе рухацца працэс далейшага зніжэння інфляцыі. Акрамя таго, будзе ацэньвацца стан плацежнага балансу краіны.

Старшыня праўлення Нацбанка адзначыў, што пасля зніжэння ставак на грашовым рынку назіраецца сітуацыя, калі і ў прадпрыемстваў, і ў насельніцтва з'яўляецца магчымасць браць крэдыты па больш нізкіх працэнтных стаўках. «У верасні па новавыдадзеных крэдытах у беларускіх рублях працэнтная стаўка склала 12,2%. Ёсць яшчэ адна тэндэнцыя, унікальная для Беларусі, яна назіраецца ўпершыню — працэнтныя стаўкі па крэдытах для фізічных асоб практычна зраўняліся з працэнтнымі стаўкамі па новавыдадзеных крэдытах для юрыдычных асоб», — растлумачыў ён. Таксама Павел Калаур паведаміў, што Нацбанк у наступным годзе плануе цалкам адмовіцца ад нормы абавязковага продажу валютнай выручкі.

Стаўка рэфінансавання 18 кастрычніка зніжана ў Беларусі да 11% гадавых. Гэта восьмае зніжэнне стаўкі з пачатку года.

## Эканоміка плюс — і ЗВР плюс

У Беларусі ёсць магчымасць на здаровай аснове павялічваць золатавалютныя рэзервы па 1—1,5 млрд долараў у год, заявіў старшыня праўлення Нацбанка. Ён растлумачыў: каб на здаровай аснове павялічыліся ЗВР, эканоміка павінна дэманстраваць пастаянны ўстойлівы рост экспарту. «У гэтым годзе 1,2 млрд долараў на чыстай аснове мы на рынку атрымалі. У асноўным за кошт таго, што насельніцтва па-ранейшаму з'яўляецца прадаўцом валюты. І гэта дало нам магчымасць на здаровай аснове нарасціць ЗВР. Цяпер рэзервы Беларусі складаюць 7,266 млрд долараў у эквіваленце. Нацыянальны банк плануе да 2020 года нарасціць золатавалютныя рэзервы да 8—8,5 млрд долараў.

## Тарыфы і падтрымка

Старшыня праўлення Нацбанка адзначыў, што праграма з МВФ прадугледжвала фінансавую падтрымку канкрэтных змен у краіне. «Гэтыя змены вызначаны і нашай пяцігадовай праграмай. Так, мы разышліся па вызначанай хуткасці гэтых змен. У прыватнасці, па тарыфах на жыллёва-камунальныя паслугі. Думаю, што мы ў краіне павінны вызначыцца, як мы будзем рухацца па тых ці іншых напрамках рэфармавання эканомікі, а потым ужо вяртацца да пытання падтрымкі з боку міжнародных арганізацый. Мы павінны адказаць на шэраг пытанняў, уключаючы пытанне фіскальных рызык: як мы будзем імі кіраваць, як іх ацэнім. Гэта вельмі няпростая праца, але яе трэба прарабіць унутры краіны», — удакладніў ён. Місія Міжнароднага валютнага фонду будзе працаваць у Мінску з 26 кастрычніка па 10 лістапада.

## Рэінжынірынг і кліентацэнтрычнасць

Перад лічбавымі тэхналогіямі вялікая і шматгранная будучыня. У гэтым плане Нацыянальны банк працягне практыку стварэння прававой, метадалагічнай і тэхналагічнай базы для лічбавай трансфармацыі банкаўскай сферы. Старшыня праўлення Нацбанка адзначыў, што ў банкаўскім сектары бачна адбываецца праглядаюцца наступныя крокі рэінжынірынгу бізнес-працэсаў банкаў, якія вядуць да кліентацэнтрычнасці, тэхналагічнай і арганізацыйнай гнуткасці. Кліентацэнтрычнасць напрамую звязана з новымі магчымасцямі збору і апрацоўкі інфармацыі, якія дазваляюць стварыць лічбавы профіль кліента. Гэта выводзіць ўзаемаадносіны «кліент—банк» на ўзровень, калі прадукты і паслугі ствараюцца і прапануюцца зыходзячы з перавагі, намераў і фінансавых магчымасцяў кліента. Справіцца з распрацоўкай падобных прадуктаў і паслуг будуць здольныя банкі, якія ўжо сёння прыступілі да распрацоўкі і ўкаранення гнуткіх ІТ-платформаў у спалучэнні з экасістэмамі адкрытых інавацый.

## Пытанні інфармацыйнай бяспекі

У цяперашні час Нацбанкам рэалізуецца праект па стварэнні ў Беларусі цэнтра маніторынгу і процідзеяння камп'ютарным нападам у крэдытна-фінансавай сферы. Як паказвае міжнародная практыка, яго стварэнне будзе садзейнічаць зніжэнню шкоды ад злачынстваў у крэдытна-фінансавай сферы, дазволіць прымаць прэвентыўныя меры, накіраваныя на процідзеянне пагрозам інфармацыйнай бяспецы ў нашай краіне. Цэнтр маніторынгу ствараецца як падраздзяленне Нацыянальнага банка і будзе з'яўляцца новай структурай для фінансавага сектара Беларусі.

## Сістэма імгненных плацяжоў

Сёння фінансавы рэгулятар распрацоўвае канцэпцыю стварэння ў Беларусі сістэмы імгненных плацяжоў. Яшчэ адным з асноўных трэндаў развіцця бізнес-працэсаў з'яўляецца ўзаемадзеянне банкаўскай сістэмы з іншымі арганізацыямі ў напрамку паляпшэння разліковага абслугоўвання кліентаў. Старшыня праўлення Нацбанка растлумачыў, што гаворка ідзе пра кругласутачны доступ з разнастайных электронных прылад да здзяйснення бяспечнай, абароненай грашовай транзакцыі. Для гэтага прымаюцца тэхнічныя, прававыя і арганізацыйныя меры.

Павел Калаур падкрэсліў, што сучасныя бізнес-працэсы ў банкаўскай дзейнасці ўжо ў значнай меры заснаваны на выкарыстанні магчымасцяў інфармацыйных тэхналогій для рэалізацыі канцэпцыі кліентаарыентаванасці, уключаючы забеспячэнне пастаяннага аддаленага доступу кліентаў да паслуг банка. «Рэінжынірынг бізнес-працэсаў у першую чаргу закрануў каналы продажаў банкаўскіх паслуг і прадуктаў, што прывяло да арганізацыйных змен у дзейнасці аддзяленняў і філіялаў банкаў. У банкаўскай сістэме дзякуючы інфармацыйным тэхналогіям ужо ідзе вызваленне персаналу ад руціннай работы ў разлікова-касавым абслугоўванні, бухгалтэрыі і справаздачнасці, што дазваляе накіроўваць кадравыя і фінансавыя рэсурсы банкаў на развіццё высокатэхналагічных напрамкаў дзейнасці», — адзначыў старшыня праўлення Нацбанка.

***

XIV Міжнародны форум па банкаўскіх інфармацыйных тэхналогіях «БанкІТ'2017» праходзіць 18—20 кастрычніка ў Мінску. Форум сабраў звыш 1,5 тысячы кіраўнікоў і экспертаў у сферы фінансаў, IT і кіравання з больш чым 10 краін. Адбудзецца 14 секцыйных пасяджэнняў, уключаючы дыскусіі, на якіх выступяць больш за 60 спікераў. Асноўным блокам тэм вызначаны такія актуальныя для фінансавай галіны пытанні, як сучасныя патрабаванні да IT-платформаў банкаў, кіраванне данымі, лічбавае ўзаемадзеянне з кліентамі і выкарыстанне ў банкаўскай сістэме тэхналогіі блокчэйн.

**Сяргей КУРКАЧ.**
*kurkach@zviazda.by*

■ Актуальна

# З ЛІСТАПАДА ПЕНСІІ ПАВЫСЯЦЦА

**Прэзідэнт падпісаў Указ №377 «Аб павышэнні пенсій». Выплаты пажылым пералічаць у сувязі з тым, што вырасла сярэдняя заработная плата па краіне. Указ закране больш за 2,5 мільёна грамадзян.**

Працоўныя пенсіі вырастуць на пяць працэнтаў. Мяркуецца, што сярэдняя пенсія ў намінальным выражэнні складзе амаль 316 рублёў. «Што датычыцца памеру павелічэння выплат у кожнага пажылога грамадзяніна, то ён будзе залежаць ад індывідуальных параметраў яго стажу работы і велічыні заробку, а таксама надбавак і даплат, якія па названай падставе пераразліку не падлягаюць», — пракаментавалі ў Міністэрстве працы і сацыяльнай абароны.

Дадатковыя расходы на пенсіі складуць 42,8 мільёна рублёў у месяц.

**Наталля ЛУБНЕЎСКАЯ.** *lubneuskaya@zviazda.by*

■ І так бывае

# ЗАГАДЧЫЦА З-ЗА НЯСТАЧЫ Ў КАСЕ ПАДПАЛІЛА КРАМУ

**У Слуцкім раёне загадчыца з-за нястачы ў касе падпаліла краму, інсцэніраваўшы крадзеж, паведамілі БЕЛТА ва УУС Мінаблвыканкама.**

Паведамленне пра ўзгаранне магазіна ў вёсцы Краснае Сяло паступіла ў міліцыю 17 кастрычніка каля 5 гадзін раніцы. Пажарныя высветлілі, што прычынай інцыдэнту стаў падпал будынка. Выявіць зламысніка ўдалося на працягу некалькіх гадзін. Аказалася, што з мэтай утойвання нястачы магазін падпаліла 43-гадовая загадчыца, інсцэніраваўшы перад гэтым крадзеж. «Жанчына некалькі месяцаў давала ў доўг прадукты харчавання вяскоўцам, — растлумачыў **начальнік крымінальнага вышуку Слуцкага РАУС Станіслаў ЧУХОЛЬСКІ.** — Грошы за пакупкі вярталіся з пенсій і заробкаў. Але далёка не ва ўсіх атрымлівалася разлічвацца своечасова, таму ў касе паступова ўтваралася нястача. Пры гэтым, напэўна, загадчыца і сама карысталася забароненай махінацыяй. Мяркуецца, што са жніўня па кастрычнік сума запазычанасці дасягнула не менш як 2 тысяч рублёў».

Даваць справаздачу перад рэвізорамі і плаціць за чужыя вэксалі зламысніца не хацела, улічваючы, што ў яе ўжо быў крэдыт для пагашэння чужых даўгоў (яны былі выяўлены раней — падчас чарговай рэвізіі крамы), таму жанчына адважылася на злачынства. «Уначы загадчыца вынесла з крамы сейф, адкрыла яго ключом і пакінула непадалёк з невялікай колькасцю капеек унутры. Побач яна рассыпала цыгарэты, паклала бутэльку гарэлкі і каўбасу. Такім чынам была інсцэніравана прысутнасць староннікі, якія нібыта здзейснілі крадзеж і падпал», — расказаў Станіслаў Чухольскі

Цяпер падазраваная знаходзіцца ў ізалятары часовага ўтрымання. У дачыненні да яе распачатая крымінальная справа па ч. 2 арт. 218 (наўмыснае знішчэнне або пашкоджанне маёмасці) КК Рэспублікі Беларусь, санкцыя якой прадугледжвае да 10 гадоў пазбаўлення волі

■

# Хутка стадыён «Дынама» атрымае новае жыццё

### Рэканструкцыю арэны плануюць завяршыць да сярэдзіны 2018 года



**Першапачаткова будоўлю хацелі скончыць да канца 2017-га. Асноўныя работы будуць завершаны сёлета, на наступны год пяройдзе мантаж мачтаў асвятлення і ўладкаванне асноўнага спартыўнага ядра. Плануецца, што з надыходам вясны рабочыя будуць манціраваць сістэму абагравання поля і ўкладваць газон.**

Зараз унутры стадыёна будаўніцтва паўднёвай, усходняй і паўночнай трыбун завершана на 90%, заходняя гатовая на 70%. Рабочыя ўжо прыступілі да аддзелкі стадыёна, таксама ўсталёўваюць дзверы, вітражы, манціруюць падвесныя столі.

Нагадаем, што стадыён «Дынама» прыме цырымонію адкрыцця і закрыцця II Еўрапейскіх гульняў, таксама там пройдуць спаборніцтвы па лёгкай атлетыцы.

**Дар'я ЛАБАЖЭВІЧ.** lobazhevich@zviazda.by

■ Мазгавы штурм

# ДАЦЬ АДКАЗЫ НА ПЫТАННІ СУЧАСНАСЦІ

## Чаго чакаюць ад першага беларускага філасофскага кангрэса

**Той, хто лічыць, што філасофія — гэта мёртвая навука, якая сябе зжыла, і ўвогуле, што гэта ўжо «не навука, а толькі каментарыі, пустыя словы», сур'ёзна памыляецца. Тэматыка першага беларускага філасофскага кангрэса, які адкрыўся ўчора ў Мінску, падобнае меркаванне цалкам зняпраўджвае.**

Кангрэс «Нацыянальная філасофія ў глабальным свеце» сабраў 500 прадстаўнікоў філасофскай эліты з 25 краін блізкага і далёкага замежжа. Для ўдзелу ў ім у Беларусь прыехаў таксама генеральны сакратар Міжнароднай федэрацыі філасофскіх таварыстваў, прафесар Лука Марыя Скаранціна.

— Мы знаходзімся напярэдадні эпохі, якую называюць грамадствам ведаў, часам, калі пераможа інтэлект. Сёння ў беларускім грамадстве, як і ў многіх іншых, адраджаецца цікавасць да ўспрымання навуковых і філасофскіх ідэй, выпрацоўваюцца прадукцыйныя падыходы да спалучэння традыцый і наватарства ў паліпцы, эканоміцы і культуры. Філасофскія веды могуць і павінны надаць новы імпульс інтэграцыі навукі і вытворчасці, інавацыйным пераўтварэнням ва ўсіх сферах жыцця грамадства, міжнародным супрацоўніцтве і інтэграцыі, — падкрэсліў у сваім выступленні на кангрэсе **старшыня Прэзідыума Нацыянальнай акадэміі навук Беларусі, акадэмік Уладзімір ГУСАКОЎ.** — Часам можна пачуць меркаванне, што па меры развіцця дакладных, тэхнікаарыентаваных навук філасофская мудрасць адступае на другі план, страчвае сваё ранейшае значэнне. Гэта не адпавядае рэчаіснасці. Мы становімся сведкамі імклівага развіцця чалавекаарыентаваных, канвергентных тэхналогій, а таксама тэхналогій, непасрэдна накіраваных на мадыфікацыю паводзін і мыслення чалавека. Менавіта ў гэтых умовах філасофія — дысцыпліна, у якой феномен чалавека, яго цялеснасці, духу і інтэлекту набывае зусім новае, востра актуальнае гучанне. Філасофія ўвязвае ў адзінае цэлае комплекс адкрыццяў і дасягненняў усіх іншых галін і напрамкаў навуковага пазнання, а таксама паказвае перспектыўныя кірункі далейшага навуковага пошуку. У рамках філасофскіх ведаў адбываецца асэнсаванне праблем, звязаных з узнікненнем і развіццём інфармацыйнага грамадства. Філасофія збліжаецца з такімі новымі навуковымі напрамкамі, як штучны інтэлект і робататэхніка. Разам з тым, яшчэ чакаюць свайго філасофскага асэнсавання феномен лічбавай эканомікі, развіццё тэхналогіі блокчэйн, эксперыменты па мадыфікацыі геному чалавека, стварэнне электронных імплантаў і многія іншыя навацыі — усё тое, што пагражае радыкальна змяніць жыццё соцыуму.

Уладзімір Гусакоў упэўнены, што філасофія можа ствараць ідэальныя мадэлі свету, злучаючы ў адзінае цэлае інтэлектуальную дзейнасць чалавека і яго каштоўнаснае стаўленне да жыцця. У сістэме сучасных сацыяльна-культурных адносін значна ўзрастае роля экалагічных каштоўнасцяў — каштоўнасці жыцця, бяспекі, гармоніі з прыродай, беражлівага стаўлення да яе. Засваенне гэтых каштоўнасцяў павінна абапірацца як на тэхнічнае пераўзбраенне грамадства, стварэнне так званай зялёнай эканомікі, так і на мноства сацыяльных праграм, накіраваных на якаснае пераўтварэнне грамадства, яго патрэб, менталітэту і выпрацоўку маральна-экалагічнага імператыва. Такі падыход будзе садзейнічаць пераадоленню негатыўных бакоў індустрыялізму і глабалізму, нівеліраванню наступстваў існавання грамадства спажывання.

— Філасофія — больш чым навука. Гэта мастацтва, — упэўнены **старшыня Пастаяннай камісіі па адукацыі, культуры і навуцы Палаты прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Ігар МАРЗАЛЮК.** — Яна дае адказы на вечныя пытанні, якія стаялі і заўсёды будуць стаяць перад чалавецтвам. Мы лічым, што пры дапамозе больш гуманнай палітыкі можам стварыць гуманнае грамадства, дзе не ўсё будзе пераводзіцца на грошы, дзе галоўнай каштоўнасцю будзе чалавек. І эканоміка павінна быць у імя чалавека, а не наадварот...

**Дырэктар Інстытута філасофіі Нацыянальнай акадэміі навук Беларусі Анатоль ЛАЗАРЭВІЧ** у сваю чаргу адзначыў, што ў сучасным свеце філасофія — не толькі тэарэтычныя, але і практычныя веды. «У сувязі з гэтым у нашым інстытуце створаны кластар практычнага значэння — Рэспубліканскі цэнтр фундаментальнай і практычнай філасофіі. Яго мэта — наблізіць філасофію да праблем беларускага грамадства, праблем сучаснай культуры», — дадаў ён.

Праграма кангрэса разлічана на тры дні. У яго рамках пройдуць два пленарныя пасяджэнні ў Акадэміі навук, тры міжнародныя навуковыя канферэнцыі на розных пляцоўках (у інстытутах філасофіі, гісторыі Нацыянальнай акадэміі навук, на факультэце філасофіі і сацыяльных навук у БДУ і ў Акадэміі кіравання пры Прэзідэнце Рэспублікі Беларусь), а таксама семінары, прэзентацыі і круглыя сталы.

**Надзея НІКАЛАЕВА.** *nikalaeva@zviazda.by*

# АРЫГІНАЛЬНЫЯ ЛЕКІ ЦІ ДЖЭНЕРЫКІ?

*(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)*




— На мой погляд, айчынная фармацэўтычная прамысловасць развіваецца дастаткова дынамічна, і задача запоўніць палову фармацэўтычнага рынку айчыннымі лекавымі сродкамі ўжо дасягнута, аднак выпрашалася яна пераважна за кошт наладжвання вытворчасці джэнерыкаў (айчынных аналагаў арыгінальных імпартных прэпаратаў, на якія закончыўся тэрмін патэнтнай аховы. — **Аўт.**), — развакае **дырэктар Інстытута фізіка-арганічнай хіміі Нацыянальнай акадэміі навук Беларусі, акадэмік Аляксандр БІЛЬДЗЮКЕВІЧ.** — Далей трэба, не адмаўляючыся ад засваення джэнерыкаў, сканцэнтраваць свае намаганні на стварэнні новых арыгінальных эфектыўных лекавых сродкаў.

Інстытут фізіка-арганічнай хіміі спецыялізуецца на стварэнні субстанцый для лекавых сродкаў, размова ідзе, як правіла, пра арыгінальныя лекавыя сродкі на аснове амінакіслот і іх вытворных. Чаму мы пайшлі менавіта гэтым шляхам? Ёсць такое сучаснае моднае паняцце, як «зялёная хімія». Амінакіслотны напрамак у стварэнні лекаў вельмі блізкі да гэтага паняцця — толькі не з пункту гледжання мінімізацыі шкоды для навакольнага асяроддзя, а ў сэнсе мінімізацыі негатыўных наступстваў для чалавека, які прымае лекавыя сродкі. Чаму? Таму што амінакіслоты — гэта прыродныя малекулы. Мы ўсе складаемся з ланцужкоў амінакіслот, якія звязаны ў пэўнай паслядоўнасці. Чалавек — гэта такі невялікі «хімічны завод», і яго функцыянаванне можа карэктавацца, калі мы змяняем ці карэктуем, так бы мовіць, сыравінныя патокі. На аснове амінакіслот намі ствараюцца высокаэфектыўныя прэпараты, якія выкарыстоўваюцца, напрыклад, для карэкцыі артэрыяльнага ціску. Колькасць пабочных з'яў ад прыёму такіх лекаў, у адрозненне ад сінтэтычнага лекавага сродку, мінімальная. Вучоныя нашага інстытута стварылі больш за 10 новых лекавых сродкаў, якія прайшлі ўсе стадыі распрацоўкі: ад лабараторыі, даклінічных, клінічных выпрабаванняў — да іх вытворчасці. Але ў такой галіне, як фармацэўтычнае забеспячэнне, ёсць свая спецыфіка: калі вы выходзіце на рынак з новым прадуктам, то натуральна, што ён не можа ў адно імгненне набыць папулярнасць. Патрабуецца час, каб пацыенты пераканаліся, што новыя лекі насамрэч эфектыўныя, што яны не цягнуць адмоўных наступстваў і што ў параўнанні з аналагамі ў іх ёсць пэўныя перавагі, напрыклад у цане.

Па сусветных мерках для стварэння арыгінальнага інавацыйнага лекавага прэпарата патрабуецца 10—12 гадоў і мінімальна каля аднаго мільярда долараў на распрацоўку і «раскрутку» на рынку новага лякарства. І буйныя фармацэўтычныя кампаніі ўкладваюць у новыя лекі фантастычныя, па нашых мерках, сродкі, бо ведаюць, што калі мэта будзе дасягнутая, то ўсе выдаткі шматразова акупяцца. Нашы ж навукоўцы пастаўлены ў больш жорсткія часавыя рамкі.

Аляксандр Більдзюкевіч упэўнены, што не кожны навуковы праект павінен абавязкова завяршацца ўкараненнем лекавага сродку. Трэба закладваць рызыкі для стварэння новых арыгінальных лекаў. Увогуле, акадэмічная навука павінна глядзець далей, а не займацца пытаннямі, якія могуць вырашыць і паспяхова вырашаюць навуковыя цэнтры і лабараторыі, створаныя на фармпрадпрыемствах. Трэба памятаць, што калі мы асвойваем толькі прэпараты, запатрабаваныя на рынку менавіта сёння, мы ўпускаем з-пад увагі, што праз год-два іншыя кампаніі выпусцяць на рынак больш дасканалыя і сучасныя прэпараты. Такім чынам мы адстаём ад канкурэнтаў на некалькі крокаў.

Сітуацыя ў фармацэўтычнай галіне хвалюе і **намесніка дырэктара па навуковай і інавацыйнай рабоце Інстытута біяарганічнай хіміі Нацыянальнай акадэміі навук, члена-карэспандэнта НАН Беларусі, начальніка НПЦ «ХімФармСінтэз» Алену КАЛІНІЧЭНКУ:**

— Фарміндустрыя ў нашай краіне налічвае зараз 38 прадпрыемстваў, але калі паглядзець, хто ж з іх вытворцы, гэта будзе ў лепшым выпадку 30 працэнтаў ад агульнай колькасці, а з айчынных субстанцый лекі выпускаюць і ўвогуле толькі адзінкі. Усе ж астатнія спецыялізуюцца на складванні імпартных лекаў у нашы ўпакоўкі. Але ва ўсім трэба ведаць меру. Баюся, што калі сітуацыя ў найбліжэйшы час не зменіцца і мы будзем па-ранейшаму займацца толькі раскладваннем па каробачках чужых распрацовак у блістарах і флаконах, то фармацэўтычнай навуцы будзе нанесены моцны ўдар. Страчваецца кваліфікацыя аналітыкаў, хімікаў, фармацэўтаў. І я лічу, што і Міністэрству аховы здароўя, і толькі што створанаму холдынгу па вытворчасці фармацэўтычнай прадукцыі трэба абавязкова звярнуць на гэта ўвагу.

Сёння галоўныя пастаўшчыкі ў нашу краіну фармацэўтычных субстанцый для вытворчасці лекаў — гэта Кітай і Індыя. А вось выпуск высокатэхналагічных субстанцый, якія не вымагаюць буйнатанажнай вытворчасці, сканцэнтраваны ў Еўропе: гэта Швейцарыя, Францыя, Германія, Данія, Чэхія, Ізраіль. Еўрапейскім шляхам пайшла і Беларусь.

На базе Інстытута біяарганічнай хіміі Нацыянальнай акадэміі навук быў створаны навукова-вытворчы цэнтр «ХімФармСінтэз» па выпуску фармсубстанцый і гатовых лекавых формаў, які спецыялізуецца на галіне супрацьпухлінных спалучэнняў. Унікальнасць новай вытворчасці заключаецца ў тым, што яна ахоплівае поўны тэхналагічны ланцужок — ад вытворчасці фармсубстанцый да гатовага прэпарата. Пры распрацоўцы і вытворчасці фармацэўтычных субстанцый і лекавых сродкаў выкарыстоўваюцца найноўшыя дасягненні ў галіне хіміі і біятэхналогіі кампанентаў нуклеінавых кіслот і іншых біялагічна актыўных злучэнняў.

— Мы сканцэнтравалі сваю ўвагу на вытворчасці навукаёмістых і высокатэхналагічных субстанцый. Іх аб'ём, як правіла, невялікі. Напрыклад, для таго каб задаволіць патрэбу краіны ў прэпараце лейкладзін, патрабуецца ўсяго 10 грам фармсубстанцыі, — тлумачыць Алена Калінічэнка. — А за тыя ж грошы, якія раней выдаткоўваліся для закупкі субстанцыі за мяжой, можна купіць 10 тон субстанцыі для аналгіну. У гэтым і заключаецца высокатэхналагічнасць. Іншай субстанцыі патрабуецца палова кілаграма ці пяць кілаграм. Напрыклад, мы не разлічвалі выпускаць такія вялікія аб'ёмы — 100 кілаграм субстанцыі — для іматыніба, але сёння выпускаем. А ўвогуле наша вытворчасць дазваляе выпускаць высокатэхналагічныя субстанцыі ў аб'ёмах ад 10 грам да 100 кілаграм. У нас устаноўлена пяць гнуткіх ліній, аснашчаных самым сучасным швейцарскім і італьянскім абсталяваннем.

Зараз мы маем 30 рэгістрацыйных пасведчанняў на субстанцыі і гатовыя лекавыя формы (20 і 10 адпаведна). Яшчэ 10 знаходзяцца на распрацоўцы і рэгістрацыі, з іх пяць — на гатовыя лекавыя формы.

На цяперашні момант каля 15 анкалагічных прэпаратаў выпускаюцца ў краіне з айчынных лекавых субстанцый.

— Зразумела, што мы не зможам вырабіць усе субстанцыі, але тое, што можам, абавязкова трэба рабіць самім, — падкрэслівае Алена Калінічэнка. — Напрыклад, свая субстанцыя для вытворчасці супрацьпухліннага бартэзамібу дазволіла зменшыць кошт на яго ўтрая. Многія анкалагічныя прэпараты вельмі дарагія, кошт аднаго флакона можа даходзіць да дзвюх тысяч долараў. А ў нас усе анкалагічныя хворыя забяспечваюцца лекамі бясплатна. Таму мы дапамагаем зрабіць прэпараты новага пакалення, якія паляпшаюць якасць жыцця анкалагічных пацыентаў, больш даступнымі. Яны дапамагаюць людзям жыць і не маюць моцна выражаных пабочных эфектаў.

— Прэпарат для лячэння хранічнага анкалагічнага захворвання крыві імацініб, які мы выпускаем з субстанцыі, што выраблена на «ХімФармСінтэзе», у 14 разоў таннейшы за яго імпартны швейцарскі аналаг глівек, — паведаміла **намеснік дырэктара па навуковай рабоце рэспубліканскага вытворчага ўнітарнага прадпрыемства «Акадэмфарм» НАН Беларусі Вольга КАЗЮЧЫЦ.**

«Акадэмфарм» быў створаны на базе Нацыянальнай акадэміі навук Беларусі ў 2009 годзе — як праўкладны праект вучоных акадэміі. Яго канцэпцыя ўключала стварэнне магутнасцяў, якія б дазволілі рэалізаваць распрацоўку фармпрэпаратаў — ад лабараторыі да вытворчага цэха. Зараз тут выпускаюцца 30 лекавых сродкаў і 12 БАДаў. Лекі вырабляюцца на аснове як беларускіх, так і імпартных субстанцый, якія закупляюцца ў Ізраілі, Італіі, Харватыі. Аб'ёмы рэалізацыі прадукцыі за дзевяць месяцаў гэтага года склалі каля сямі мільёнаў долараў. І, што немалаважна, прыкладна 60—70 працэнтаў прадукцыі, што тут выпускаецца, з'яўляецца інавацыйнай.

**Надзея НІКАЛАЕВА.** *nikalaeva@zviazda.by*



## МАЛЕНЬКАЕ Я — ГЭТА Я

Калі бачу, як дворнік у парку зграбае ў кучкі прыгожае восеньскае лісце, маё ўнутранае «Я» пратэстуе. У такі момант хочацца падбегчы да яго і папрасіць не рабіць гэтага. Альбо раскідаць той жоўта-барвовы дыван зноў на зямлю.

Падобнае адчуванне ў мяне было пасля прагляду дзіцячага спектакля «Маленькае Я — ГЭТА Я». Актрыса Таццяна Крыцкая прапанавала маленькім гледачам зрабіць уласнаручна галоўнага героя казкі. Кожнаму раздала па ружовым паветраным шарыку ды яркай стужцы, валосікі з воўны, папяровы вочкі ды носік, да якіх быў прымацаваны двухбаковы скотч. Усім дзеткам дапамагалі бацькі, таму цацкі атрымаліся практычна аднолькава бездакорныя. Маю ж увагу прыцягнуў хлопчык з саламянымі валасамі. Ён таксама спачатку, гледзячы на астатніх, прынёс свайму дзядулю шарык і папрасіў прывязаць да яго ваўняную фрызуру. Мужчына ўжо хацеў сам прыклеіць вочкі ды носік. Але хлопчык нечакана спыніў яго: «Дзеда, пачакай. Я сам!»

Малы спачатку прыклеіў нос, потым на тым жа ўзроўні — вочкі. Валасы ў шарыка пры гэтым апынуліся не зверху, а знізу. Мы пераглянуліся з мамамі, якія сядзелі побач. Маўляў, як незвычайна ў яго атрымалася, нетыпова. І толькі паспелі так падумаць, як дзядуля адабраў у хлопчыка той шарык і хуценька пачаў аддзіраць папяровы нос. Мне хацелася падбегчы да мужчыны і сказаць: «Дзядулечка, што ж ты робіш?..» Але не паспела... Шарык гучна лопнуў. Трэба было бачыць расчараванне ды разгубленасць, якія з'явіліся ў вялікіх вачах хлопчыка.

У гэты момант хтосьці з дарослых паспрабаваў выратаваць сітуацыю і працягнуў дзядулю цэлы шарык. Той акуратна аддзёр з пашкоджанага вочкі і носік і пачаў пераклейваць на новы правільна, так, як ва ўсіх.

Дадому вярталася з думкай: «Як жа цяжка дзіцяці застацца сабой». Чамусьці ўспомніла сваё паступленне ва ўніверсітэт. Менавіта тады я вырашыла цалкам перайсці на беларускую мову. Паколькі зрабіць гэта ў новым горадзе, дзе цябе ніхто не ведае, значна прасцей.

Памятаю, калі першы раз прыехала на выхадныя дадому, мама папрасіла: «Можа, у краме лепш па-руску размаўляй». Справа ў тым, што ўсе вясковыя дзеці, якія паступалі вучыцца, прыязджаючы да бацькоў, стараліся размаўляць чыста па-руску. Гэта лічылася нармальным. А такога, каб хтосьці вярнуўся з горада і размаўляў па-беларуску, не было.

Былі і тыя, хто казаў: «Ды ты са сваёй беларускай мовай так замуж ніколі і не выйдзеш. Хлопцаў адпужваеш толькі». Шчыра прызнацца, у парыве адчаю былі моманты, калі я думала ў паўсядзённым жыцці адмовіцца ад мовы. Нават некалькі дзён спрабавала размаўляць па-руску. Але мяне хапіла ненадоўга. Цяпер, калі хтосьці пытаецца: «А ты і з бацькамі размаўляеш па-беларуску?», толькі ўсміхаюся. Так, і з бацькамі. І з мужам — ён яшчэ да знаёмства са мной таксама прыняў рашэнне перайсці на мову. Так што галоўнае не здраджваць сабе. Калі шум свету гучнейшы, чым голас тваёй душы, ты прайграеш.

З майго першага курса прайшло ўжо больш за 10 гадоў. Усе ў вёсцы ўжо прызвычаіліся, што я размаўляю па-беларуску. Ды і мне на момант ваганняў было амаль дваццаць. А калі чалавеку тры годзікі... Баюся, што наступны раз той хлопчык з саламянымі валасамі ўжо не захоча рабіць штосьці сам, бо будзе баяцца памыліцца.

Вось так самыя блізкія і мегаклапатлівыя людзі, думаючы, што робяць дабро, наносяць непапраўную шкоду. У выніку дзеці вырастаюць няўпэўненымі ў сабе, жывуць, азіраючыся на іншых. Ім важней, чым свая мара, што пра іх падумаюць.

Многія ў дарослым узросце наноў вучацца прыслухоўвацца да сябе, спрабаваць, рызыкаваць. Але на гэта трэба шмат мужнасці і сіл, бо мінулы досвед нікуды не падзець, ён назаўсёды з намі. Як той шарык, які лопнуў, але яго кавалкі засталіся на дне душы.

**Надзея ДРЫНДРОЖЫК.**
*nadzieja@zviazda.by*

Сямейная газета

Выпуск №20 (87)

■ Гэта па-нашаму!

# Як арыгінальна сустрэць жонку з радзільні



**«Прыгожая выпіска з радзільні па-беларуску» — такая незвычайная паслуга з'явілася ў сталіцы гэтым летам. Стварыць свята каханай і немаўляці вырашыла дапамагчы татам беларусікаў і беларусачак Святлана АЎЧЫННІКАВА.**

Святлана разам з камандай аднадумцаў прапаноўвае мужчынам вялікую кольказць цікавінак з нацыянальным каларытам. У прыватнасці, тата можа ўзяць у арэнду аўтэнтычныя строі для сябе і сваёй жонкі. А таксама набыць адзежу для маленькага беларусіка (у ёй, дарэчы, пасля можна і пахрысціць дзіцятка) ды канверт на выпіску з радзільні, які трансфармуецца ў коўдрачку ў ложак ці каляску. На апошнім замест пышнага ружовага ці блакітнага банта — стужка з беларускім арнаментам. Усё гэта мала таго, што якаснае і выглядае цудоўна, дык пры гэтым яшчэ нясе глыбокі сэнс.

— Нашы продкі лічылі: тое, што ты надзяваеш, моцна ўплывае на цябе, — кажа Святлана. — Вельмі важна правільна спалучаць тканіну, арнаменты-абярэгі і каляровую гаму. Спрадвеку для дзетак, асабліва ў першыя дні жыцця, выкарыстоўвалі пераважна белы колер як сімвал чысціні. Колерам жаноцкасці лічыўся блакітны, таму што мы, жанчыны, лагодныя, як вадзічка, журчым, супакойваем нашых мужчын. Чырвоны — мужчынскі колер, колер абароны, актыўнай энергіі, агню. А мы ж з самага нараджэння адзяваем нашых дзяўчынак у ружовае, а хлопчыкаў — у блакітнае... І пры гэтым хочам, каб жанчыны не былі феміністкамі, а мужчыны слабымі?..

*(Заканчэнне на 5-й стар. «СГ».)*

■ Круглы стол

# НЕ ВЫХОЎВАЙ ДЗЯЦЕЙ — ВЫХОЎВАЙ СЯБЕ

## Усё адно яны будуць падобныя да цябе

**«У аўтобус зайшоў тата з сынам на руках. Я падхапілася, каб саступіць ім месца. Але мужчына здзівіў сваёй рэакцыяй: «Што вы?! Сядзіце, я ж сына гадую». Гэтую гісторыю падчас круглага стала, які прайшоў перад узнагароджваннем пераможцаў конкурсу «Моцная сям'я — моцная дзяржава», расказала Валянціна РАЖАНЕЦ, дэпутат Палаты прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь. І дадала, што гэта на сёння хутчэй выключэнне. Часцей даводзіцца назіраць іншае. Заходзіць маці з дзіцем, абвешаная цяжкімі сумкамі. Сына ўсадзіла, а сама стаіць, мучыцца...**

**Як вы ўжо зразумелі, тэма выхавання дзетак і іх бацькоў была ў цэнтры ўвагі падчас дыскусіі. Таксама шмат гаварылі пра ролю таты ў сям'і.**

*(Заканчэнне на 2-й стар. «СГ».)*




Фота БЕЛТА.

■ Трэці ўзрост

# ДАБРО ВЯРТАЕЦЦА...

## ЯК ДАЖЫЦЬ ДА СТА ГАДОЎ?


Ефрасіння Паўлаўна ЕРМАКОВА ўжо адзначыла векавы юбілей.

*— Ай, маці, ды ляжы ты, зараз дома холадна, не трэба засцілаць тое пакрывала...*
*— А раптам хто прыйдзе...*

**Так бывае і ў простыя дні, не тое што ў святочныя. Ефрасіння Паўлаўна ЕРМАКОВА заўсёды рада людзям, вось толькі з кожным годам госці да бабулі заходзяць усё радзей. Яно і не дзіва. Сяброўак яе ўжо даўно не стала, а сама яна днямі адзначыла 100-гадовы юбілей. А яшчэ гадоў 40 таму ўрачы казалі, што ёй не жыць...**

ЗА апошнія тры-чатыры гады бабуля не прыняла ніводнай таблеткі. Ды ўрачы кажуць, што непатрэбныя яны ёй. Выдатна абыходзіцца і без акуляраў. У жанчыны нават ніякай групы інваліднасці няма. Неяк уначы бабуля паскардзілася родным: «Сэрца млее». Выклікалі хуткую дапамогу, урачы агледзелі: ціск 120 на 80, кіслароднае напаўненне добрае, і кардыяграма ў межах нормы, ды кажуць: «Бабулі, напэўна, сумна стала».

А днямі прыпеўкі прыгадвала, родныя за ёй сёе-тое запісалі.

— Толькі апошні год яна ў мяне пачала здаваць, чуць стала горш і хадзіць. Цяжка ёй на палачку абапірацца, ёй бы хадункі якія, — расказвае Таццяна Вольскіене, дачка Ефрасінні Паўлаўны.

Бабуля прывітліва маша мне рукой са свайго ложка і вельмі здзіўляецца, што, аказваецца, гэта да яе карэспандэнт у госці завітаў.

— Нарадзілася я ў вёсцы Крыўск Буда-Кашалёўскага раёна. Маці мая памерла рана — я ў сёмы клас хадзіла. Тыф тады быў... Дык я пасля з братавай жыла, дапамагала ёй ва ўсім. Бацька ў воласці служыў, — расказвае Ефрасіння Паўлаўна.

Тата яе займаў адказную пасаду (галоўны на раёне), сачыў за парадкам, па вёсках ездзіў, а вось сваёй гаспадаркай часу займацца яму неставала, дык родныя браты дапамагалі. Але з-за гэтага сям'я яшчэ і пацярпела. Фрося пасля школы хацела далей вучыцца на настаўніцу. А ў той час для паступлення трэба было браць даведку ў сельсавеце — дзяўчыне яе не далі. Сказалі, маўляў, на бацьку людзі працавалі.

Адразу пасля школы дзяўчына пайшла на льнозавод. Праца гэта была цяжкая, брудная, ручная, вярталася яна дамоў — і нос, і рот пылам забітыя.

І хоць важнай асобай быў яе бацька, жыла сям'я бедна. Неяк абзавялася Фрося паліто, ды і таго ледзь не пазбавілася, бо бацька тады на яе глянуў і кінуў: «Аддай лепш дзецям братавай, а ты і так пераходзіш». Плакала яна тады горка, што нічога ў яе няма, а сама ж маладзенькая. Праўда, ад сястры Маруты неўзабаве перапалі ёй боцікі з мехам — «румыначкі». Вось ужо дзяўчына і «пафарсіла».

Пра вайну бабуля ўспамінае, што не ўсе немцы былі благія. Напрыклад, яна расказвала пра дзяншчыка, які гаварыў, што «вайне не гуд, вайна дрэнна». Побач з іх вёскай не было лясоў, і ворагі, якія так баяліся партызан, атабарыліся ў вясковых хатах, у тым ліку і ў той, дзе жыла Фрося. А дзяўчына ў гэты час захоўвала каштоўныя дакументы...

— У той час хоць і жылі людзі бедна, ні пра якія выгоды і льготы не думалі, а проста сумленна працавалі, — кажа Ефрасіння Паўлаўна.

— Некаторыя рэчы разумееш з гадамі. Памятаю, як паставяць нешта на стол, а маці кажа: "А я ўжо пад'ела" ці "Я пазней". А што там пасля нас паясі — сям'я ж вялікая (пасля вайны ў маці чацвёра нарадзілася, у яе і медаль ёсць — «Маці-гераіня»). Гэта яна клапацілася, каб дзецям хапіла, сама не даядала, — успамінае Таццяна Сямёнаўна. — Напэўна, жыццё закаліла гэта пакаленне. Колькі гора і цяжкасцяў перажылі людзі. У мамы першы муж у вайну загінуў, і яна засталася адна з маленькім дзіцем, у першыя ж дні Вялікай Айчыннай забілі і яе брата. Усю скаціну вораг панішчыў, жанчыны ў плугі ўпрагаліся, каб зямлю араць. На сваіх плячах ільнокастрыцу цягалі... І маці ж хварэла, памятаю, бацька казаў: «Няхай я памру, а яна жыве — хоць дзяцей падрасціць». Гадоў 45 ужо прайшло, як яго не стала. А маці ўсё з намі побач.

***— Дык у чым жа сакрэт даўгалецця?***

— Яна вельмі спакойная, добрая, у жыцці ні з кім не перасварвалася. Мы, як раслі, ніколі ні на кога голас не павысіла. Калі бацька расшуміцца, ціхенька выйдзе на вуліцу, перастаіць. Яе ў вёсцы ўсе паважалі, сяброўка дык і лісты сюды слала. Маці мая ёй і дзяцей паглядзіць, і ў двары падмяце, тая так і казала: «Ты, цётка, мне як матка». А то было — сястра яе на туберкулёз хварэла, дык мы з маці хадзілі за тры кіламетры да яе, дапамагалі, бялізну мылі, ракі побач не было, даводзілася ваду з калодзежа цягаць. Бацьку, памятаю, гэта не падабалася, баяўся, што яна заразіцца і хваробу ў дом прынясе. А вунь не заразілася. Можа, ёй з нябёсаў цяпер усе і дапамагаюць. Мама, ты з зяцем хоць калі пасварылася?

— Ды што ты! — абураецца Ефрасіння Паўлаўна.

Ужо 40 гадоў, як дачка прыглядае за маці. Яе, 60-гадовую, Таццяна забрала, калі жыла з мужам і маленькім сынам у інтэрнаце, у пакойчыку на дванаццаць метраў.

«Забярыце маці, а то памрэ», — прасілі аднавяскоўцы пасля таго, як у лютым у маразы выпадкова заўважылі яе ляжачай на могілках. Тады не стала малодшага сына Ефрасінні — Мішы. Добрага, шчырага, яго ўсе любілі. У час службы ў арміі хлопец атрымаў медаль «За адвагу», выратоўваў людзей на пажары. Яго хацелі ў Маскве пакінуць, ды хлопец вырашыў: «Маці адна на вёсцы засталася, дом старэнькі, мне ў Буда-Кашалёве кватэру дадуць, і я яе забяру». Міша наведаўся да маці, падарункаў прывёз, дроў насек, абняў, закружыў яе, падзяліўся, што жаніцца будзе... і раптам яго не стала.


«Гэты абрус маці рабіла яшчэ да вайны»,— кажа дачка Таццяна ВОЛЬСКІЕНЕ.

Некалькі разоў родныя думалі, што страцяць любую маці. У 64 гады Ефрасіння Паўлаўна трапіла ў рэанімацыю, урачы ўжо папярэджвалі: «Рыхтуйцеся, яна не выкараскаецца», у дзевяноста жанчына цяжка хварэла на грып...

Пакуль мы гутарылі, бабуля пачала драмаць. Ёй ужо цяжка доўга выседзець, тым больш што калі стагоддзе за плячыма, начамі часта не спіцца... Калі бачыш, як дачка клапоціцца пра маці, бы пра маленькае дзіця, міжволі знаходзіш адказы на ўсе пытанні, якія яшчэ не паспела задаць. Каб жыць доўга, трэба проста любіць людзей. Тое цяпло і святло, якое ім дорыш, пасля вяртаецца.

**Алена ДЗЯДЗЮЛЯ.**
*dziadziula@zviazda.by*

# НЕ ВЫХОЎВАЙ ДЗЯЦЕЙ — ВЫХОЎВАЙ СЯБЕ

***(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар. «СГ».)***

**Вера МАРТЫНАВА, дэкан факультэта сацыяльна-педагагічных тэхналогій Беларускага дзяржаўнага педагагічнага ўніверсітэта імя М. Танка:** «Мы правялі вялікае сацыялагічнае даследаванне сярод старшакласнікаў. Адно з пытанняў, якое ім задалі, — "На чым павінна быць заснавана шчаслівая сям'я?" Амаль 30% адказалі, што на ўзаемаразуменні, 25% — на каханні. Гэтыя лічбы радуюць. Але трывожыць тое, што адказнасць як аснову паспяховай сям'і адзначылі ўсяго толькі 4,6% старшакласнікаў, узаемную падтрымку — 1,8%. Хоць, на мой погляд, узаемная падтрымка і адказнасць — самыя галоўныя складнікі шчаслівай сям'і. Амаль палова старшакласнікаў, якіх мы апыталі, становіча ставіцца да сужыцця, якое яшчэ называюць грамадзянскім шлюбам. Прыблізна такое ж стаўленне да гэтай з'явы і ў іх бацькоў (40%)».

**Сергій ЛЕПІН, протаіерэй, старшыня Сінадальнага інфармацыйнага аддзела Беларускай праваслаўнай царквы:** «Мова ёсць дом быцця», казаў Хайдэгер. Калі мы дазваляем сужыццё называць шлюбам, аўтаматычна ўжо здзяйсняем дыверсію, дапускаем ідэю альтэрнатыўнасці законным адносінам. На мой погляд, гэта небяспечна. Сужыццё — гэта не што іншае, як нежаданне браць на сябе адказнасць».

**Юрый САНЬКО, ксёндз-канонік, сакратар Канфедэрацыі рымска-каталіцкіх епіскапаў Беларусі:** «Моладзь не адчувае адказнасці. Відаць, таму, што іх тата не адчувае сваёй адказнасці за маму, мама — за тату. Нас хвалюе, што ў краіне расце колькасць разводаў. Таксама сёння мы занепакоены такой з'явай, як чайлдфры. Калі маладыя людзі кажуць: «Навошта нам дзеці? Мы кахаем адно аднаго і будзем жыць для сябе». Гэта новы выклік сучаснасці».

**Вера МАРТЫНАВА:** «За тое, што школа павінна рыхтаваць дзяцей да сямейнага жыцця, выказалася 80% апытаных бацькоў. Мы ўнеслі прапанову ў Міністэрства адукацыі, што трэба ў сціснутым школьным графіку знайсці месца псіхалогіі. Вельмі важна, на мой погляд, у школах увесці і практыку бацькоўскіх універсітэтаў. Мы сёння павінны дапамагчы бацькам у выхаванні дзяцей».

**Сергій ЛЕПІН:** «Праваслаўная царква падтрымлівае ўвядзенне прадмета «Псіхалогія сямейнага жыцця». З іншага боку, мы заклапочаны, каб гэты адзін з самых важных прадметаў выкладалі сапраўды падрыхтаваныя педагогі. Бо вельмі часта падобныя дысцыпліны дастаюцца настаўнікам, якім не хапіла гадзін. Чалавек, які вучыць жыццю, сам павінен быць жывым».

**Ганна ЯШЧУК, дацэнт Беларускага дзяржаўнага эканамічнага ўніверсітэта:** «Самае лепшае выхаванне — гэта асабісты прыклад. Нездарма кажуць, не выхоўвай дзяцей — выхоўвай сябе. Усё адно яны будуць падобныя да цябе. Гэта датычыцца не толькі настаўнікаў, але ў першую чаргу бацькоў».

**Святлана СІТНІКАВА, першы намеснік старшыні Беларускага саюза жанчын, рэктар Мінскага абласнога інстытута развіцця адукацыі:** «У нашай дзяржаве быў такі досвед, быў такі прадмет, як "Псіхалогія сямейнага жыцця". Але настаўнікі аказаліся негатовыя. А высокакваліфікаваных сямейных і крызісных псіхолагаў у нас катастрафічна мала. Неабходна гэта пытанне прапрацоўваць. У канцы лістапада адбудзецца нацыянальны форум «Сям'я XXI стагоддзя». Абавязкова вынесем гэтае пытанне на абмеркаванне».

**Кацярына МАЛЬЦАВА, дырэктар Мінскага гарадскога цэнтра сацыяльнага абслугоўвання сям'і і дзяцей:** «У нашым цэнтры працуюць і сямейныя, і крызісныя псіхолагі. Але 12 чалавек не ў сілах фізічна ахапіць увесь Мінск, не кажучы пра краіну. Усяго два такія цэнтры ў Беларусі. Таму важна, каб бацькоўскія ўніверсітэты працавалі паўсюдна, ва ўстановах адукацыі, у цэрквах, пры грамадскіх аб'яднаннях».

**Юрый САНЬКО:** «У нас пры касцёле ёсць школа сямейнага жыцця. Больш за 80% наведвальнікаў прыходзяць не для таго, каб пасля працаваць у сацыяльных цэнтрах ды праводзіць кансультацыі, а каб самім стварыць здаровыя сем'і».

**Кацярына МАЛЬЦАВА:** «Ужо каторы год мы дапамагаем сем'ям, якія выхоўваюць анкахворае дзіця. Як правіла, пасля працяглага лячэння яны распадаюцца. Муж сыходзіць з сям'і. Адна з прычын: жанчыны ўзвальваюць усе клопаты пра дзіця на свае кволыя плечы, не даючы магчымасць мужчыну ўдзельнічаць. У нас у цэнтры адкрываецца аддзяленне дзённага знаходжання для работы з такімі сем'ямі, каб псіхолагі маглі максімальна падключаць да зносін з малечай тату».

**Людміла АНДРЭЕВА, галоўны ўрач Мінскага абласнога наркалагічнага дыспансера:** «Чаму ў нас так шмат інфантыльных мужчын? Думаю, у тым ліку і таму, што жанчыны не гатовыя раздзяліць адказнасць, паверыць у свайго мужа, што ён можа яе панесці. Жаночая ж вера мае вялікую сілу».

**Юрый САНЬКО:** "Часта пасля нараджэння дзіцяці жанчына цалкам акунаецца ў мацярынства. Мы заўсёды раім маладым мамам павесіць над ложкам плакат: «На першым месцы — я і муж, дзіця — вынік нашага кахання».

**Святлана СІТНІКАВА:** «Раней на ўручэнне ордэна Маці губернатары чамусьці забываліся запрашаць мужчын. Нарэшце сітуацыя змянілася. Сёлета ў Мінску была поўная зала татаў. Яны ж сыгралі не апошнюю ролю ў нараджэнні пяці і больш дзяцей».

**Таццяна КРАЎЧАНКА, старшыня Беларускай асацыяцыі шматдзетных бацькоў:** «Хлопчыкаў змалку трэба выхоўваць так, каб яны адчувалі сваю адказнасць за стварэнне сям'і. Магу правесці майстар-клас *(смяецца)*. Маім нявесткам, лічу, пашанцавала. На маіх сыноў яны спакойна могуць пакінуць маленькіх дзетак. Хлопцы змогуць і памперсы памяняць, і пакарміць. Лічу, што тым сем'ям, дзе таты актыўна ўдзельнічаюць у выхаванні дзяцей, развод не пагражае».

**Надзея ДРЫЛА.** *dryla@zviazda.by*

■ Сакрэты прыгажосці

# ГАЛАВА Ў ПАРАДКУ:

## галоўная тэндэнцыя — здаровыя валасы

**Валасы — важны элемент знешнасці любой жанчыны і любога мужчыны. Здаровыя і прыгожыя, яны заўсёды прыцягваюць увагу, дапамагаюць адчуваць сябе ўпэўнена. Зразумела, для падтрымання прывабнага знешняга выгляду патрабуецца рэгулярны догляд. Якія прычоскі сёння ў модзе і як даглядаць валасы, расказала цырульнік Алена БЯРОЗКА.**

***— Пры выбары прычоскі або стрыжкі варта прытрымлівацца ўласнага стылю ці сачыць за моднымі тэндэнцыямі?***

— Усё залежыць ад стану душы, асабліва ў жанчын. З вопыту скажу, яшчэ моладзь сочыць за модай. Мужчыны больш пастаянныя ў стрыжках. У жанчын яшчэ і ад настрою залежыць, нават ад надвор'я, пары года. Усе дамы хочуць мадніцаць незалежна ад узросту, але больш гэта праяўляецца вясной. Як толькі сонейка засвяціла, бяжым да цырульніка.



***— Якія галоўныя трэнды гэтага асенняга сезона?***

— Сёння ўжо няма масавых «пафасных» прычосак, шалёных начосаў. Раней перад Новым годам, 8 Сакавіка мы з цяжкасцю паспявалі абслугоўваць кліентаў. Тыя ж хімічныя завіўкі робім зараз 1—2 разы на месяц. Цяпер попытам карыстаюцца лёгкія, паўсядзённыя ўкладкі. Папулярная і стрыжка піксі з рознымі каляровымі ўкрапінамі: дзесьці пасмачка рудая, дзесьці сіняя. Меліраванне ўжо не ў модзе. Часта робяць цікавыя афарбоўкі з элементамі меліравання. У модзе таксама складаная афарбоўка з элементамі светлых пасмачак. Калі жадаем атрымаць эфект выгаралых валасоў, асвятляем на пару тонаў, таніруем. З часам фарба вымываецца і атрымліваецца натуральна.

***— Ёсць меркаванне, што сродкі па доглядзе валасоў варта перыядычна мяняць, нібыта валасы прывыкаюць і няма патрэбнага эфекту?***

— Мяняць варта, калі адчуваеш, што сродак па доглядзе ўжо назапасіўся ў валасах. Шампунь усё ж такі прызначаны для мыцця і ачышчэння валасоў. А вось маскі і бальзамы маюць уласцівасць назапашвацца, таму іх варта мяняць рэгулярна. Кожны чалавек павінен для сябе зрабіць выбар метадам спроб і памылак. Гэта ўсё індывідуальна. Я раю мяняць і спрабаваць розныя лінейкі. Скончылася адно, зрабіў выснову і бярэш іншае. Потым заўсёды ведаеш, да чаго можна вярнуцца. Дарэчы, варта выкарыстоўваць народныя маскі.

***— Адрозніваецца догляд валасоў у залежнасці ад іх колеру?***

— Безумоўна. Напрыклад фарба блонд больш раскрывае кутыкулу воласа, ён становіцца больш порысты. Бо бландзінкі фарбуюцца на больш высокім працэнце акісляльніка, чым брунеткі або шатэнкі. Валасы становяцца больш ломкія, захаваць іх здаровымі складана. Да таго ж бландзінкам трэба раз у месяц-паўтара фарбаваць карані. Калі фарбавацца ў цёмны колер, варта быць асцярожным з выбарам адцення. Бо цёмны колер можа рабіць чалавека старэйшым. Калі ёсць сівізна, я рэкамендую аддаваць перавагу светлым колерам. Калі адрастаюць валасы з сівізной, яна будзе менш бачна на светлых валасах, чым на цёмных. У любым выпадку, каб захаваць прыгожыя і здаровыя валасы, патрэбен добры догляд, і не важна, які колер вы маеце.

***— А ў хатніх умовах можна фарбаваць валасы?***

— У хатніх умовах часта не выконваецца тэхніка афарбоўкі. Напрыклад, калі падфарбоўваць карані, за 5—10 хвілін да змывання трэба абавязкова прачасаць валасы па ўсёй даўжыні, каб атрымаўся раўнамерны колер. Многія не выконваюць гэтую інструкцыю, таму колер каля каранёў можа адрозніваўца...

***— Ёсць меркаванне, што фарбы, якія ўтрымліваюць аміяк, больш шкодныя для валасоў?***

— Калі не аміяк, то іншы хімічны элемент у фарбе будзе прысутнічаць. Тут трэба ўлічваць індывідуальную пераноснасць. У мяне ёсць кліентка, у якой алергія на аміяк, таму яна карыстаецца фарбамі, што яго не ўтрымліваюць.

***— Часта бывае, што ўбачылі прычоску, якая прыйшлася нам даспадобы. Што казаць майстру, каб ён зразумеў, які вынік мы хочам атрымаць?***

— Калі вы хочаце незвычайную прычоску, лепш прынесці карцінку, фатаграфію. Цяпер ёсць інтэрнэт, і можна знайсці нават асобны элемент: дзесьці скроню або пасмачку руžовую. Кліенту і цырульніку важна знайсці паразуменне. Калі цырульнік не разумее, чаго хоча кліент, лепш зусім не брацца за работу.

***— Цяпер модна рабіць паліроўку, керацінавае аднаўленне, стрыжку гарачымі нажніцамі. Што з гэтых працэдур сапраўды прынясе карысць для вашых валасоў, а што ствараe толькі часовы эфект?***

Асабіста маё меркаванне: гэта ўсё рэкламны ход. Пры паліроўцы надзяваецца насадка, якая прыбірае сухія і пасечаныя кончыкі, але разам з імі прыбіраюцца і здаровыя валасы. Тая ж стрыжка гарачымі нажніцамі. Валасы не могуць быць здаровыя ад таго, што яны запайваюцца.

***— Ці адрозніваецца догляд валасоў у цёплую і халодную пару года?***

— Летам ідзе пашкоджанне сонцам. Валасы выгараюць, становяцца ломкімі. У халодную пару года яны псуюцца пад уздзеяннем холаду. У любым выпадку для кожнага чалавека патрэбны індывідуальны догляд. Тут трэба не самарошца, пагаварыць са сваім майстрам. Добры цырульнік абавязкова дасць параду. А як знайсці свайго цырульніка? Найлепшы спосаб — гэта сарафаннае радыё. Да таго ж, добры цырульнік павінен умець рабіць усё, нават масаж галавы.

***— Як часта патрэбна мыць галаву?***

— Галаву трэба мыць па меры неабходнасці. У аднаго можа быць праз дзень, у іншага раз на тыдзень. Калі ёсць неабходнасць мыць кожны дзень, выбіраем шампунь для штодзённага выкарыстання.

***— Наколькі часта патрэбна падстрыгаць кончыкі валасоў?***

— Таксама ўсё індывідуальна. Аднаму раз у тры месяцы, іншаму раз на год. Калі вы хочаце захаваць даўжыню валасоў, то старайцеся падразаць як мага радзей і па меры таго, як яны пачынаюць бліцацца, пашкоджвацца, становяцца больш тонкія. Але падразаць варта своечасова, каб валасы выглядалі здаровымі і дагледжанымі.

***— Калі выпадаюць валасы, як зразумець, ці патрэбна біць трывогу?***

— Норма выпадзення валасоў — да 100 у дзень. Часам складана знайсці прычыну, па якой лезуць валасы, а аказваецца, ты проста перанерваваўся. Бываюць выпадкі, калі не дапамагаюць ні народныя сродкі, ні маскі. У такім выпадку мы рэкамендуем звяртацца да трыхолага. Яны, як правіла, бяруць валасы на абследаванне, і ўжо іх глыбока вывучаюць. Часта прычына можа хавацца ва ўнутраных збоях, тады могуць прапісаць нейкі вітамінны комплекс. Нават харчаванне адбіваецца на стане валасоў. Трэба ў рацыён уключаць прадукты, якія ўтрымліваюць кальцый, цынк, жалеза.

***— Чым будзе адрозніваецца догляд валасоў мужчыны і жанчыны?***

— Мужчыны па прыродзе больш лянівыя. Але і ім трэба добра выглядаць. Таму ў некаторых выпадках варта прыбягаць да пэўных працэдур. У мяне ёсць адзін кліент, малады, але ўжо сутыкнуўся з сівізной. Хацеў пафарбавацца, але сароме́ўся вельмі. Ёсць мужчынская лінейкі фарбы, якія як таніроўка змываюцца. І вось такой фарбай мы з ім паспрабавалі затаніраваць сівыя валасы. Эфект пераўзышоў чаканне. Пры сустрэчы ён мне расказаў, што ўсе гаварылі, як добра ён выглядае, але ніхто не заўважыў, што пафарбаваўся.

***— Некаторыя мужчыны сутыкаюцца з праблемай аблысення: шмат хто думае, што гэта спадчыннае і нічога з гэтым зрабіць нельга. Ці варта ў такой сітуацыі звяртацца да спецыяліста?***

— Часцей гэта сапраўды генетычная праблема. Але калі вы сутыкнуліся з аблысеннем, лепш схадзіць да трыхолага. Я рэкамендую мужчынам, якія лысеюць, масаж галавы альбо шампуні з утрыманнем перцу. Хоць шампунь проста змывае бруд з валасоў, але ўсё ж любое пашчыпванне — гэта прыток крыві да валасных цыбулін. Да таго ж, хто не любіць масаж? А тут яшчэ сумяшчаем яго з карысцю.

**Карына ВАКУЛІЧ**

■




## Кава з водарам мовы

Аб прыгажосці роднай мовы, як аб тым, што патрабуюцца пэўныя высілкі для яе адраджэння, можна разважаць доўга. А яшчэ можна праявіць крэатыўнасць і на справе даказаць сваю павагу да нацыянальных каштоўнасцяў, нават калі сфера вашай дзейнасці не звязаная непасрэдна з той жа літаратурай або асветніцтвам.



Прыклад таму — аздобленне пакецікаў з цукрам, якія я атрымала разам з кавай капучына, замоўленай у мінскім рэстаране-бістро «LIDO». Сама па сабе кава была вельмі якасная, але ж яе смак падаўся мне яшчэ больш прывабным, калі на цукровых пакецІках я пабачыла сакавітыя беларускія прымаўкі: «Гаспадарку весці — не штанамі трэсці», «Любіш паганяць — любі і каня гадаваць».

Спадабаліся мне і міні-ілюстрацыі пад кожнай з прымавак. Пагадзіцеся, файная задумка, якая, дарэчы, не патрабуе буйных фінансавых выдаткаў, але дадае да водару кавы цудоўны «водар» роднай мовы.

## «Геральдычная» ягада,

### або Абед па-скандынаўску

Сёй-той можа й здагадаўся, што гаворка зараз пойдзе пра брусніцы. Вядома, існуе безліч напояў, дэсертаў дый марынадаў, для прыгатавання якіх выкарыстоўваюцца гэтыя ягады, аднак менавіта брусьнічнае варэнне карыстаецца асаблівай павагай у нарвежцаў і шведаў. Яго падаюць у якасці соусу не толькі да знакамітых міні-катлетак kjottboller, што ў перакладзе з нарвежскай азначае «шарыкі з мяса», але і да мясных стэйкаў, смажаной бульбы і абавязкова да запечаных у духоўцы свіных рабрын — традыцыйнай на тэрыторыі Скандынаўскага паўвострава каляднай стравы.



Пра густы спрачаюцца, аднак дастаткова хоць бы раз пакаштаваць тую ж адбіўную з брусьнічным варэннем, каб адчуць сапраўдную асалоду ад спалучэння кісла-салодкага смаку ягад са смакам мяса і зразумець, што нешта ў гэтым ёсць, адчуўшы, як першапачатковы скептыцызм хутка саступае месца захапленню ад вынаходніцтва нашчадкаў вікінгаў, якія былі і адважнымі ваярамі, і добрымі едакамі.

Трэба адзначыць і тое, што ўжыванне брусьнічнага варэння ў якасці соусу надае ежы не толькі пікантны смак; паляпшаецца і сам працэс стрававання, што тлумачыцца вялікай канцэнтрацыяй адпаведных мікраэлементаў у складзе брусніц. Але ж было б зусім несправядліва не нагадаць пра тое, што і ў Беларусі да гэтых ягад заўсёды адносіліся з пашанай. Тыя, хто цікавяцца геральдыкай, напэўна ведаюць, што выява брусніц упрыгожвае герб гарадскога пасёлка Шаркаўшчына. Ну, а што датычыцца той жа ежы, то раней у многіх рэгіёнах Беларусі вараная бульба падавалася на стол менавіта з брусьнічным варэннем. Гатавалася яно без цукру, і не толькі ў мэтах эканоміі, але ж і таму, што выдатна захоўвалася ў гэткім натуральным выглядзе ў цёмных і прахалодных гаспадарчых памяшканнях. Пагадзіцеся, у нашых продкаў было насамрэч здаровае харчаванне, хай сабе і не такое разнастайнае, як у цяперашнія часы.

**Наталля РУЖЫЦКАЯ.**

# ШЛЯХ ЛІЗЫ, ШЛЯХ ДОЎЛЫ

**Даўней у беларускай вёсцы бабкай-павітухай была звычайна жанчына сталага веку. Яна з'яўлялася і акушэркай, і дзіцячым доктарам, і дарадчыцай парадзіхі, і памочніцай ёй па гаспадарцы ў першыя дні пасля родаў. Бабка-павітуха была вельмі паважаным чалавекам у вёсцы. Сяляне верылі ў магічную сувязь паміж павітухай і «павітымі» ёю дзецьмі. Маўляў, паводзіны бабкі могуць station ўча ці адмоўна паўплываць на здароўе і характар дзіцяці. Таму да павітух прад'яўлялі высокія патрабаванні: яны павінны былі быць веруючымі, добразычлівымі, акуратнымі, сумленнымі. Пры першым купанні бабка мела права даць немаўляці імя. Цесная сувязь дзіцяці і яго бацькоў з павітухай захоўвалася на працягу ўсяго жыцця.**
**Сёння ўся адказнасць за паспяховыя роды ляжыць цалкам на ўрачах-акушэрах і самой парадзісе. На змену ж бабкам-павітухам прыйшлі доўлы, гатовыя аказаць эмацыянальную, арганізацыйную і практычную падтрымку жанчыне падчас цяжарнасці, родаў і пасля. Толькі, у адрозненне ад бабак, яны не маюць права ўмешвацца ў сам працэс родаў.**



Фота Антаніны ХАТЭНКІ.

## Трывожнасць, прафесія, начныя «раз'езды»



— Самае складанае ў прафесіі доўлы — адрывацца ад уласнай сям'і. Праўда, датычыцца гэта толькі суправаджэння родаў. Усю астатнюю работу можна спланаваць так, як табе зручна. Многія лічаць, што вось прыйшла, за ручку парадзіху патрымала і ўсё! Куды там!? Тут галоўнае — не адлюстроўваць трывожнасць. Важна настроіцца і захоўваць адчуванне нейтральнасці і бяспекі. І гэта нягледзячы на тое, што ў мяне самой таксама могуць быць нейкія праблемы, клопаты — усё пакідаю дома. Цяжка зрывацца ноччу. Ведаеце, я не магла паехаць з дзецьмі на выхадных да бабулі ў іншы горад: «чакалі», калі тая ці іншая жанчына народзіць, — з усмешкай успамінае доўла **Ліза Шэфер**.

Цяпер Ліза не бярэцца суправаджаць роды. Са з'яўленнем на свет чацвёртага дзіцяці клапатлівая маці проста не можа сабе дазволіць экстранныя «раз'езды» па горадзе.

— Першыя мінімум паўгода пасля родаў ніколі не працую, бо ведаю, што гэта для мяне ўразліва, — кажа Ліза. — У нашай краіне доўлы пакуль няма ў рэестры прафесій, але ўсё да гэтага ідзе. На жаль, у большасці беларусаў доўла асацыюецца выключна з родамі. Не ведаю, чаму менавіта каля гэтай тэмы так усё раздзімаецца. Бо колькі ўсяго адбываецца да і пасля нараджэння дзіцяці!

Ліза з цеплынёй расказвае пра свой доўльскі гуртох па падрыхтоўцы да родаў і жыцця з немаўляткам. Першы раз жанчына назвала сябе доўлай у 24 гады пасля таго, як другі раз стала мамай і вывучылася на кансультанта па грудным выкормліванні. А потым ужо былі спецыялізаваныя курсы для доўлаў.

## Свабода, міліцыя, белая варона

— Ой, яна з сынам і мужам. Цудоўна! — Ліза заўважае ў акне **Лану Чаркашыну** (адну з тых жанчын, якія скарысталіся доўльскімі паслугамі Лізы). — А які хлопчык ужо вялікі!

Ліза і Лана не бачыліся каля двух з палова гадоў. Жанчыны спяшаліся падзяліцца падзеямі з жыцця, гутарылі пра падарожжы, побыт і, вядома, дзяцей.



— А ў майго Лёшкі такія «замашкі» пайшлі. Учора пасля прагулкі ў горадзе заявіў: «Давайце таксі закажам», — дзеліцца Лана.

— Ёсць у каго, — жартуе Ліза.

— Так, яшчэ засталося нешта ад таго жыцця, — крыху бянтэжыцца жанчына.

Страх расстацца з «тым» жыццём, як кажуць матулі, заўсёды пужае. І менавіта тут на дапамогу можа прыйсці доўла.

— Ліза паказала мне, што неабавязкова развітвацца са свабодай, да якой я вельмі прывязалася за 33 гады жыцця *(смяецца)*. Яна зняла гэтае псіхалагічнае напружанне, бычыцам у адзін момант усё павінна стаць паіншаму, — дзеліцца Лана. — Быў час, калі я адчувала сябе адной супраць усяго грамадства. Мы з мужам вырашылі загартоўваць сына з ранняга ўзросту. Аднойчы нясу дзіця ў слінгу, ножкі яго звісаюць (як і трэба), і тут пачынаецца з усіх бакоў: «Яму холадна. Купіце каляску!», «Яно ж захварэе. Куды вы, бацькі, глядзіце!?» На мяне нават адзін раз выклікалі міліцыю...

— Памятаю, як ты мне тады тэлефанавала, — падхапіла Ліза.

— Для мяне гэта быў шок, я пасля тры дні не магла выйсці з кватэры. Мяне назвалі «нездаровай маці, якая ходзіць і марозіць дзіця»! Ліза тады мяне моцна падтрымала. Я адчула, што не адна.

— І гэта ж лета было! — успамінае доўла. — Для тых, хто не ведае, слінга-шалік — гэта некалькі слаёў тканіны! Дзіця пацее ў ім заўжды!

## Дрэды, хатнія роды, непрадказальнасць

— Па табе, Ліза, і не скажаш, што шматдзетная маці! — далучылася да нашай гутаркі **Наталля Талай**.



— І па табе таксама! — была радая бачыць сваю кліентку доўла.

— Так, але я стараюся больш такога «сталага» іміджу прытрымлівацца.

— А я вырашыла змяніцца, не гуляць у «як трэба і як прынята». Быць такой, якая ёсць. Ну вось даўно я хацела гэтыя дрэды, — указваючы на свае валасы, кажа Ліза.

— Мне здаецца, доўлу жанчына выбірае не па знешнім выглядзе, а інтуітыўна. Стыль зносін, словы, тэмы — вось гэта важна, — дадае Лана. — Мне Лізу ўвогуле на адным з форумаў для бацькоў параілі.

— А мы з ёй пазнаёміліся яшчэ да маёй трэцяй цяжарнасці праз агульных сяброў, — успамінае Наталля. — Муж на партнёрскія роды не згадзіўся, таму «падключыла» Лізу. На жаль, не ўсё атрымалася па плане: роды рэч непрадказальная *(усміхаецца)*.

— Іншае пытанне, што доўле «падыходзяць» не ўсе. Я не магу пайсці на роды з чалавекам, які бачыць ува мне не тое, што я магу яму даць. Возьмем нават хатнія роды, на якія мяне аднойчы запрасілі як акушэрку. Так, у мяне шмат ведаў у псіхалогіі, «калямедыцынскіх», але я не ўрач! З той жанчынай я не стала працаваць, — тлумачыць Ліза. — Тут важна разумець розніцу: акушэрка сочыць за працэсам і ацэньвае роды, доўла — за жанчынай і яе эмацыянальным і фізічным камфортам.

Доўла ні ў якім разе не прапагандуе хатнія роды:

— Абіраць месца родаў — асабістая справа жанчыны. Задача дзяржавы — забяспечыць гэта права з захаваннем бяспекі для ўсіх удзельнікаў родавага працэсу. Хочацца, каб грамадскі рэзананс, які сёння выклікала тэма хатніх родаў, зрушыў праблему ў лепшы бок.

> **У Беларусі аказанне акушэрскай дапамогі дома незаконнае.**

— Лічу, што жанчына павінна нараджаць у бяспечнай, камфортнай абстаноўцы. Асабіста я заўжды разумела, што дома нараджаць не хачу: трэба думаць, як усё арганізаваць. Я не змагла б цалкам пагрузіцца ў працэс, калі побач знаходзіцца старэйшыя дзеці і патрабуюць маёй увагі, — кажа Наталля.

## Юрыдычная адказнасць, самаадукацыя, здзіўленыя позіркі

— Кожны ўрач на сваім працоўным месцы абмежаваны моцнай юрыдычнай адказнасцю за якасць медыцынскай дапамогі. Доўле ў гэтым плане крыху лягчэй. Нашы медыкі жывуць у гэтай сістэме і па-іншаму ніяк. Таму, напэўна, вось гэты дыялог «урач—доўла» пакуль у Беларусі не зусім наладжаны, — лічыць Ліза.

Доўла пастаянна ўдасканальвае свае веды. Навучанне ў асноўным праходзіць за мяжой або анлайн:

— У нашай краіне ўсе гэтыя мае сертыфікаты пакуль не прызнаныя, але не яны робяць мяне доўлай. Табе проста даюць інфармацыю. Увогуле, доўльства патрабуе шмат самаадукацыі.

— Ліза неяк расказвала, што на працягу месяца слухала пасляродавыя гісторыі матуль. Такі курс праводзіла адна амерыканская школа. І гэта вельмі каштоўна! Я адчула гэта на сабе, калі яна прыйшла да мяне на пасляродавае спавіванне, — кажа Наталля.

— А чаму на ролю доўлы не падыходзіць мама, сястра, бабуля? — пытаюся я. — Яны таксама могуць выслухаць.

— Магчыма, калі ў вас даверлівыя адносіны, тады гэта і «спрацуе». Мая сям'я глядзела на мяне і не разумела, чаго я хачу. Маўляў, нарадзіла два разы сама, зробіш гэта і трэці. Якая доўла? Навошта? Усё проста: мне таксама патрэбна ўвага! — тлумачыць Наталля.

— Ды я і сама адчуваю гэтыя здзіўленыя позіркі «а ты ўвогуле хто?», калі першы раз заходжу ў дом да кліентаў, — кажа Ліза.

— Мама, канешне, вельмі мне дапамагала з дзіцем. Гушкала маю дачушку, гуляла з ёю. Яна добра спраўляецца з роляй бабулі, але не больш, — дадае Наталля.

## Здаровая псіхіка, шакаладны брауні, стаматолаг для стаматолага

— Мужчыны цяпер часцей бяруць невялікі адпачынак пасля нараджэння дзіцяці. Цікава, якога роду пытанні пачынаюць задаваць навапечаныя таты. Калі раней гэта было нешта накшталт «Як дзіця купаць і карміць?», дык зараз «Як мая жонка сябе адчувае?», «Як магу ёй дапамагчы?» І гэта цудоўна! Бо што патрэбна для таго, каб немаўля расло здаровым? Здаровая мама са здаровай псіхікай! Увогуле, псіхалагічны стан жанчыны пасля нараджэння дзіцяці вельмі зменлівы. Пра адсотак пасляродавых дэпрэсій мала кажуць, а ён вялікі, — дзеліцца назіраннямі Ліза.

— Задача доўлы не ў тым, каб прыйсці і пастукаць пальцам па стале перад мужам «Жонка павінна ляжаць два тыдні пасля родаў, прынось ёй гарбату ў ложак кожны дзень». Не, доўла — гэта не аб тым. Гэта пра сям'ю, пра сістэму. Я павінна дапамагчы гэтай сістэме працаваць з малым на руках. Часам быць медыятарам паміж жанчынай і мужчынам ці нават іншымі сваякамі, каб ім было прасцей у новых ролях працягваць жыццё.

> **«У большасці беларусаў доўла асацыюецца выключна з родамі. Не ведаю, чаму менавіта каля гэтай тэмы так усё раздзімаецца. Бо колькі ўсяго адбываецца да і пасля нараджэння дзіцяці!»**

Цікава, але доўла і па хатняй гаспадарцы дапаможа, і вячэру з абедам прыгатуе.

— Мы з Лізай шакаладны брауні гатавалі! — падхапіла Лана. — Увогуле, гэта такі простыя, але вельмі патрэбны акт клопату аб жанчыне.

— А ці патрэбна доўле доўла? — пытаюся я.

— Канешне, гэта як стаматолагу патрэбен стаматолаг (хоць у розных родах могуць быць розныя патрэбы нават у адной і той жа жанчыны). Я, напрыклад, не магу сама сябе за ручку патрымаць і сказаць, што ўсё добра. У другіх і трэціх родах муж вельмі добра сыграў гэтую ролю. На чацвёртых родах ён быў заняты старэйшымі дзецьмі.

У найбліжэйшай будучыні Ліза плануе перавесці свае паслугі ў анлайн-фармат. На якасць гэта не паўплывае, а каштаваць будзе крыху танней.

* * *

— Ліза, у нас захавалася відэа, дзе я ўся такая сур'ёзная ў акулярах нашу Лёшку ў слінгу і пытаюся ў цябе «Ці ўсё я правільна раблю? Мне здаецца, яму няўтульна ў галоўцы». Пры гэтым дзіця спакойна спіць. Цяпер гэта выглядае абсурдам! А тады мы толькі вучыліся быць бацькамі. Дзякуй за ўсё, — апранаючыся, на бягу «кінула» Лана.

**Кацярына АСМЫКОВІЧ.**
*asmykovich@zviazda.by*

## КАМПЕТЭНТНА:

**Марыя ТАКУНОВА, урач акушэр-гінеколаг, кіраўнік Школы мацярынства і жаночага здароўя «Ліра»:**

— У Беларусі з 2015 года ў радзільнях партнёрам у родах можа быць толькі муж ці маці. Тым самым выключаецца магчымасць удзелу на родах доўлаў. Тлумачэнне гэтаму адно. Вакол паняцця «доўла» сярод урачоў лунае шмат гісторый аб іх актыўным удзеле ў родавым працэсе. Лічыцца, што яны могуць адгаворваць жанчын ад прапанаванай анестэзіі, сумнявацца ў неабходнасці стымуляцыі, прытрымліваючыся выключна натуральных поглядаў на роды, не дапускаючы альтэрнатыў. У большасці сваёй гэтыя гісторыі далёкія ад рэальнасці, але акушэры-гінеколагі ім вераць. А калі менавіта ўрач нясе адказнасць за жыццё і здароўе жанчыны і дзіцяці ў родах, вельмі не хочацца ўступаць у канфрантацыю і ў нейкія неадкладныя моманты даказваць абгрунтаванасць сваіх дзеянняў.

Ні для каго не сакрэт, што партнёрская дапамога можа быць вельмі эфектыўнай. Парадзіха ў прысутнасці партнёра можа лепш расслабіцца, лягчэй перажываць боль, а гэта адназначна дапамагае добраму праходжанню родаў. Многія цяжарныя хочуць узяць з сабой на роды памочніка, але мужа ў якасці партнёра не разглядаюць. Ім хочацца нейкага больш чулага, беражлівага, менавіта жаночага клопату пра сябе. Таму ў гэтай ролі цалкам можа выступіць доўла.

# Як арыгінальна сустрэць жонку з радзільні

*(Заканчэнне.*
*Пачатак на 1-й стар. «СГ».)*

Папулярнасцю ў маладых татаў карыстаюцца і беларускамоўныя вінілавыя налепкі на машыну. Накшталт «Каханая, дзякуй за дачку (ці сына)», «Я стаў татам! Прымаю віншаванні — «бі-бі».

— Некалькі татаў ужо замаўлялі ў нас гэтыя налепкі. Дык потым дзяліліся ўражаннямі: «Едзеш па горадзе, і незнаёмыя людзі бібікаюць. Гэта так прыемна». Таксама мы распрацавалі два наборы абярэжных магнітаў — восем для дзяўчынкі і столькі ж для хлопчыка (даём апісанне сэнсу кожнага арнаменту). Яны таксама прымацоўваюцца на машыну.

**«Сёння нікога не здзівіш тым, што сустрэў жонку з радзільні на лімузіне з ружамі ды шарыкамі. Так робяць ва ўсім свеце. Іншая справа, калі ты скажаш, што сустрэў каханую як сапраўдны беларус — на карэце, пад гукі цымбалаў...»**

Святлана Аўчыннікава і яе каманда — першыя і пакуль адзіныя ў нашай краіне, хто арганізоўвае выпіску з радзільні з нацыянальным каларытам, улічваючы старажытныя беларускія традыцыі. Адаптуючы да сучаснасці назапашаныя ў нашым народзе за сотні гадоў веды. Свята, якое яны ладзяць, займае агулам 15—20 хвілін. Самім татам рабіць нічога не трэба. За іх усё робіць аніматар у вобразе Купалінкі, Бусла ці Шляхцянкі XVII стагоддзя. Пры жаданні можна замовіць жывую музыку.

— У нашай камандзе ёсць некалькі цымбалістак. З маіх назіранняў, дзеткі сябе спакойна адчуваюць, менавіта калі чуюць гукі цымбалаў. Сустрэча з радзільні запісваецца на відэакамеру. А якія каларытныя фотаздымкі атрымліваюцца ў ліцвінскай намітцы, шапцы з пер'ем паўліна ці ў беларускім венчыку ды поясе з арнаментам!

Усяго за 15—20 хвілін бацькі і сваякі атрымліваюць не толькі прыемныя эмоцыі ды памяць для сябе і сваіх дзетак на доўгія гады, але і даведваюцца шмат цікавага.

— Мы дорым маладым бацькам пры сустрэчы з радзільні солід, насенне дрэва ды абярэжную ляльку. Так яны не толькі даведваюцца пра традыцыі нашых продкаў, але і працягваюць іх у сваіх сем'ях.

Солід — гэта адзіная манета ВКЛ і Рэчы Паспалітай, якая чаканілася на тэрыторыі Беларусі, у Бярэсці. Нашы продкі, калі дзіцяці спаўнялася 7 гадоў, дарылі яму першы грош. Тым самым сімвалічна падкрэслівалі пераход на новы этап. З гэтага часу ў дзетак з'яўляліся адмысловыя абавязкі і правы. Мы цалкам рэканструявалі солід, тым самым вырашылі адрадзіць перадачу сямейнай рэліквіі з пакалення ў пакаленне. Уявіце, бацькі будуць захоўваць манету сем гадоў, а пасля падорыць яе свайму дзіцяці. Гэта будзе важкі падарунак, а не проста прыстаўка, ноўтбук, планшэт... Так робяць усе. І гэта выклікае не тыя глыбока цёплыя пачуцці.

У нашых продкаў была і яшчэ адна цудоўная традыцыя. Калі дзіцятка нараджалася, яны садзілі ў яго гонар дрэва — мужчынскае ці жаночае. Даглядалі яго ўсёй сям'ёй. Тым самым змалку прывівалі сыну ці дачушцы адказнасць. З сямі гадоў дзеткі самі пачыналі клапаціцца пра сваё дрэва.



Яшчэ я раблю абярэжныя лялькі. Для немаўлятак яны называюцца спавівашкі. Даўней лічылася, што праз такую немудрагелістую цацку дзіцяці перадаецца цяпло і энергія мамы. Лялечка звычайна клалася ў ложачак побач з немаўлём і ахоўвала яго. Таму я да кожнай сваёй спавівашкі прымацоўваю яшчэ і падрабязную інструкцыю, каб маці, калі пажадае, магла зрабіць такі абярэг сама.

***— Паслуга, наколькі я зразумела, арыентавана больш на татаў, якія хочуць зрабіць для жонкі сюрпрыз?***

— Так, важны менавіта эфект сюрпрызу. Бо жанчыны вельмі нервуюцца, і, што ім ні прапануй, яны ад усяго адмовяцца. Аднак потым, калі сюрпрыз удаўся, вельмі ўдзячныя свайму каханаму. Кажуць: «Які ж ты малайчынка, гэта было так незвычайна!» Асабліва, калі пачынаюць садзіць дрэва ў гаршчок, глядзяць, як зрабіць лялечку-спавівашку.

Сёння нікога не здзівіш тым, што сустрэў жонку з радзільні на лімузіне з ружамі ды шарыкамі. Так робяць ва ўсім свеце. Іншая справа, калі ты скажаш, што сустрэў каханую як сапраўдны беларус — на карэце, пад гукі цымбалаў...

***— Света, як у тваёй галаве нарадзілася такая цудоўная ідэя?***

— Я вельмі шаную ўсё беларускае. Вучылася ў беларускамоўнай школе, у штодзённым жыцці з задавальненнем размаўляю па-беларуску. Па першай адукацыі я гісторык. Апошнія некалькі гадоў пачала больш глыбока цікавіцца славянствам, старажытнымі традыцыямі нашага народа. Цешуся, што паступова ідзе адраджэнне ўсяго беларускага. Я, як жанчына і будучая маці, адчула, што важна адраджаць традыцыі беларускага бацькоўства. Паглядзела, што ў нашай краіне ёсць арганізацыі, якія суправаджаюць з радзільні. Аднак яны гэта робяць, як усе па ўсім свеце. А хочацца захаваць сваю адметнасць, каб мы разумелі, хто мы, і выкарыстоўвалі тое, што нам пакінулі нашыя продкі. Калі бацькі зразумеюць, што яны беларусы, тады і іх дзеткі будуць з гонарам несці сваю беларускасць.

**«Самім татам рабіць нічога не трэба. За іх усё робіць аніматар у вобразе Купалінкі, Бусла ці Шляхцянкі XVII стагоддзя».**

***— Ты сама хацела б, каб цябе сустрэлі так з радзільні?***

— Шчыра кажучы, я нават не магу ўявіць сабе ўсё гэта па-іншаму. Толькі так. Толькі сваё, роднае, беларускае. Бо я сама беларуска і хачу гэта пачуццё перадаць сваім будучым дзецям. Мне было б не надта прыемна, калі б мяне сустрэлі з радзільні са звычайным торцікам, які я нават не змагу пакаштаваць. Тортам з памперсаў таксама сёння нікога не здзівіш. А мы ж сустракаем з караваем, зробленым паводле беларускіх традыцый. Яго можа есці нават мама, якая корміць дзіця грудным малаком. Калі буду глядзець сваё відэа сустрэчы з радзільні, прыемна, што яно будзе знята на фоне беларускамоўнай расцяжкі, дзе напісана «Любая мая, я цябе кахаю!» Гэта гучыць так цёпла, вы толькі паслухайце! Нават калі тата не замаўляе жывую музыку, мы ўсё адно ўключаем гукі цымбалаў у запісе, каб ствараць каларытную атмасферу. Уяўляеце, дзіця выходзіць першы раз у свет і чуе гукі цымбалаў! Гэта не перадаць словамі! Проста цяплее ўнутры, калі ты гэта бачыш і чуеш. Я нават гавару гэта, і ў мяне слёзы наварочваюцца. Мне хацелася б, каб мяне сустракалі так. Таму хачу падзяліцца гэтым з беларускімі сем'ямі. Каб матулі ды таты адчулі вось гэтую цеплыню ў сэрцы ад свайго, ад роднага. А нашы дзеткі з нараджэння былі сапраўднымі беларусамі.



**Надзея ДРЫНДРОЖЫК.**
*nadzieja@zviazda.by*

■ Вясельны калькулятар

# КОЛЬКІ КАШТУЕ АЖАНІЦЦА?

**Пачуць ад свайго каханага прапанову стаць яго жонкай — адзін з найлепшых момантаў у жыцці кожнай дзяўчыны. Менавіта з гэтай хвіліны пачынаюцца ўсе вясельныя клопаты, якія патрабуюць пэўных грашовых выдаткаў.**
**Яшчэ ўчарашнія жаніх і нявеста, а сёння — муж і жонка Уладзімір і Людміла МАЛЯРЭВІЧЫ *(на фота)* расказалі, колькі каштавала свята маладой сям'і:**

— Адразу скажу, што цэны «кусаюцца». А з сучаснымі заробкамі памочніка ўрача і інжынера збіраць грошы прыходзіцца доўга. І нават калі ў вас ужо ёсць пэўная сума, без дапамогі бацькоў не абысціся. У нас адразу ўзнікла жаданне проста распісацца. Але мары пра белую сукенку і развагі наконт таго, што вяселле бывае толькі аднойчы ў жыцці, перамаглі. І мы прыняліся за справу, — дзеліцца Людміла.

Калі справа датычыцца такога мерапрыемства як вяселле, людзі, якія прапаноўваюць свае паслугі, быццам забываюць, што жывуць у Беларусі: цэны называюць выключна ва ўмоўных адзінках. Выключэннем стаў толькі загс:

— Спярша аднеслі заяву ў загс. За роспіс трэба заплаціць дзяржпошліну ў памеры ад 1 да 3 базавых велічынь у залежнасці ад таго, які від рэгістрацыі вы выбіраеце. Калі гэта не ўрачысты роспіс — 1 базавая, напалову ўрачысты — 2, урачысты — 3 базавыя велічыні. Самы дарагі від — гэта выязная рэгістрацыя. Яна каштуе 10 базавых. Мы абралі звычайны ўрачысты роспіс. Ён абышоўся ў 69 рублёў, — расказвае Уладзімір.

Наступным этапам для маладых стаў падбор вясельных касцюмаў. Падчас яго звычайна прыходзіцца траціць не толькі шмат грошай, але і шмат часу. І калі купіць касцюм для жаніха не выклікае асаблівых цяжкасцяў, то выбар сукенкі можа стаць сапраўднай праблемай для дзяўчыны. Трэба ж выбраць менавіта «сваю», каб адпавядала постаці, упрыгожвала, а галоўнае — падабалася самой маладой.



— Касцюм для Валодзі знайшлі хутка і заплацілі даволі танна — 450 рублёў. Сваю сукенку прымярала ў трох салонах і нарэшце знайшла такую, як і хацела: каб цана была прымальная і якасць. Брала яе напракат, каштавала гэта разам з вэлюмам і астатнімі дробязямі 790 рублёў.

Пакупка ўбрання для маладой абыходзіцца ў сярэднім у 900—1000 беларускіх рублёў.

Калі з прапанаваных варыянтаў нельга нічога выбраць, можна пашыць сукенку на заказ. Гэта паслуга будзе каштаваць ад 1000 рублёў і больш, — кажуць Малярэвічы.

Але маладой яшчэ патрэбна зрабіць макіяж і прычоску. Такія ўпрыгожванні будуць каштаваць у межах 120 рублёў. Апошнім часам пайшла тэндэнцыя рабіць пробныя макіяж і прычоску. Гэта таксама платная паслуга, якая ацэньваецца ў 80—100 рублёў.

Важным элементам на вяселлі з'яўляюцца заручальныя пярсцёнкі. Па традыцыі, яны павінны быць гладкія, без аніякіх гравіровак і ўставак, каб сямейнае жыццё было без перашкод. Маладыя кіраваліся менавіта гэтым прынцыпам.

— Нам пашчасціла, мы трапілі на 30% зніжкі, таму пярсцёнкі нам абышліся ў 570 рублёў. А калі б крыху памарудзілі, плацілі б ужо 800 рублёў, — задаволена расказвае галава сям'і.

Калі жаніх і нявеста ўжо апранутыя, застаюцца арганізацыйныя пытанні:

— Тамаду мы знайшлі за 600 рублёў, — распавядаюць Уладзімір і Людміла. — У фатографа аплата пагадзінная. За чатыры гадзіны — 160 рублёў. Паслугі відэёграфа абышліся ў 490 рублёў. Шмат грошай патрэбна на дэкор залы — 460 рублёў, фужэры і ўпрыгожаныя бутэлькі — 30, бутаньеркі — 5 рублёў за адну, бамбаньеркі — 50 рублёў, патрэбна таксама купляць прызы для гасцей — гэта каля 100 рублёў, свечкі — 28 рублёў, вясельны торт — 150 рублёў, заказ у рэстаране на чалавека — 70 рублёў, і яшчэ шмат розных дробязяў. Увогуле, мы падлічылі, што вяселле нам абышлося амаль у 8 тысяч беларускіх рублёў. Але мы ні аб чым не шкадуем. Бо памяць, якая ў нас засталася, бясцэнная.

**Анастасія ГРУК** ■

БЕЛАРУСБАНК

У праграме не толькі 7 шахматных турніраў, але і цікавая пазнавальная і культурна-забаўляльная праграма. Так, усе ахвотныя змогуць згуляць партыю ў «жывыя шахматы», як у прыгодах Гары Потэра (гэта калі на вялізным шахматным полі пад адкрытым небам замест фігур стаяць жывыя людзі, якія выконваць указанні свайго караля). Акрамя таго, арганізатары падрыхтавалі больш за 10 майстар-класаў, інтэрактыўныя фотазоны, экспазіцыю старадаўніх шахмат, шахматны карнавал. На фестывалі будзе працаваць шахматны кінатэатр на падушках, фокуснік пакажа дзівосы з выкарыстаннем шахматных фігур. Кожны ахвотны створыць сваімі рукамі незвычайную шахматную паштоўку. А напрыканцы свята будуць падведзены вынікі конкурсаў на лепшы фотаздымак і малюнак.

— Мы запрашаем усіх аматараў шахмат далучыцца да конкурсу фотаздымкаў «Шахматы і я», — кажа Кацярына Таберка. — Вам трэба сфатаграфаваць сябе за шахматнай дошкай, з шахматным тортам, у ложку ў выглядзе ладдзі ці седзячы на слане. Няма межаў фантазіі! Фотаздымкі прымаюцца ў раздрукаваным выглядзе, фарматам 10 на 15 см. Для тых, хто любіць маляваць, мы прыдумалі конкурс «Шахматнае каралеўства». Малюйце на зададзеныя тэмы ў любой тэхніцы. Фармат работ не больш за А3. Намінацыі: да 7 гадоў — Дзіцячы мат, 8—10 гадоў — Ход канём, 11—13 гадоў — Гардэ, 14—16 гадоў — Ператварэнне, 17 і старэйшыя — Голы кароль. Для ўсіх узростаў праходзіць конкурс малюнкаў «Чорная пешка», а таксама конкурс на лепшы шахматны комікс! Свае творчыя работы можна здаць загадзя або 4 лістапада пры рэгістрацыі.

Усіх удзельнікаў фестывалю чакаюць сертыфікаты, прызы і падарункі. А пераможцаў — каштоўныя падарункі, кубкі, медалі, дыпломы. Для бацькоў арганізатары падрыхтавалі лекцыю па тэме «Як і навошта гуляць у шахматы з дзецьмі дома».

**Надзея ДРЫЛА.**
*dryla@zviazda.by*




## Загадкі ад дзядулі

Хлапчукі і вы, дзяўчаткі,
Сёння можа кожны з вас
Адгадаць мае загадкі.
Калі ласка, у добры час!

☺ ☺ ☺

*Хатку на сабе нясе,*
*Выставіўшы рожкі,*
*І на кусцік запаўзе,*
*Адпачыўшы трошкі.*
(Смоўж)

☺ ☺ ☺

*Век траскоча, не змаўкае*
*Чорна-бела, чарнавока,*
*Што ўкрадзе —*
*у гняздо хавае,*
*Па зямлі бяжыць*
*з падскокам.*
(Сарока)

☺ ☺ ☺

*Ад яго ўцякаюць кошкі,*
*Ходзіць ноччу па двары.*
*А яшчэ ён любіць косткі,*
*Што даюць гаспадары.*
(Сабака)

☺ ☺ ☺

*Пад лісток, і пад ігліцу,*
*І пад мох у лесе мяккі*
*Брацік з роднаю сястрыцай*
*Пахавалі свае шапкі.*
(Грыбы)

☺ ☺ ☺

*Вецер іх збірае ў статкі.*
*З імі разам жыве гром.*
*Сыплюць на зямлю ападкі*
*Яны вечарам і днём.*
(Хмары)

☺ ☺ ☺

*Летам над вадой лунае,*
*Любіць адпачыць ў чароце.*
*Рыбку ўбачыць — уцякае:*
*Тая з'есці яе хоча.*
(Страказа)

**Аляксей ГАЛАСКОК.**

# ХАТНЯЯ ЭНЦЫКЛАПЕДЫЯ

ПАКАШТУЙЦЕ!

## САЛАТА З ФАСОЛЯЙ І ГРЫБАМІ



**Спатрэбіцца:** *1 слоік кансерваванай фасолі, свежыя шампіньёны — 500 г, 3 невялікія марынаваныя агуркі, 2 рэпчатыя цыбуліны, перац чорны, соль, зяленіва (пятрушка, кроп).*

Грыбы нарэзаць саломкай і абсмажыць іх на патэльні да гатоўнасці, дадаць дробнанарэзаную цыбулю. Нарэзаць агурок дробнымі кубікамі. З фасолі зліць сок.

Злучаем нарэзаныя агуркі, смажаныя грыбы з цыбуляй і высыпаем туды ж фасолю. Змешваем і запраўляем алеем, солім, перчым, пасыпаем зяленівам. Салата павінна настаяцца 5—10 хвілін.

## ГЕДЛІБЖЭ — КУРЫЦА Ў СМЯТАНЕ



**Спатрэбіцца:** *курыца — 800 г, цыбуля рэпчатая — 3 шт. (сярэдняга памеру), часнок — 2 шт. (сярэдняга памеру), смятана — 200 мл, алей — 30 мл, кары — 1 ч. л, соль — на смак, перац чырвоны салодкі молаты — на смак, пятрушка — невялікі пучок.*

Кавалачкі курыцы солім і кладзём на патэльню з алеем. Тушым пад вечкам хвілін 30 амаль да гатоўнасці. Пакуль курыца тушыцца, пачынаем гатаваць соус. Рэжам цыбулю. Памер нарэзкі значэння не мае. Кладзём у патэльню з алеем. Дадаём часнок, але гэта справа смаку, цалкам можна абысціся і без яго. Абсмажваем да залацістага колеру.

З дапамогай блэндара робім са смажаных цыбулі і часнаку пюрэ. Дадаём у яго смятану, соль, кары, чырвоны молаты салодкі перац. Дробна рэжам зеляніну і дадаём у соус.

Перакладаем кампаненты падліўкі ў сатэйнік ці каструлю. Дадаём 100 мл вады ці булёну. Калі трэба, солім і добра змешваем. Соус гатовы.Тушаную курыцу кладзём у соус і тушым яшчэ 10—15 хвілін.

УМЕЛЫЯ РУЧКІ

## ПЕНАЛ З МАЛАНАК







ЗАКОНЫ СТЫЛЮ



## 10 ІСЦІН ПРА КАЛГОТКІ

1. Калготкі цёмных тонаў візуальна падаўжаюць ногі, а белы колер кароціць іх.
2. Ажурныя калготкі добрыя з высокім абцасам, але не з балеткамі.
3. Танныя няякасныя калготкі маюць круглыя швы, якія могуць шараваць. Акрамя таго, іх бачна пад адзеннем. Выбірайце калготкі з плоскімі швамі альбо зусім без швоў, тады зможаце надзець іх нават пад самую тонкую сукенку.
4. Тонкія чорныя калготкі з падоўжным швом ззаду падыходзяць толькі паненкам з ідэальна роўнымі нагамі.
5. Сандалі і басаножкі не прадугледжваюць калготак!
6. Буйныя прынты на галёнках візуальна поўняць іх.
7. Матавыя шчыльныя калготкі вельмі прасцяць і выглядаюць строга. Такі варыянт не падыходзіць маладым дзяўчатам.
8. Максімальны працэнт утрымання лайкры ў калготках — 30%. Калі на ўпакоўцы паказана больш, то перад вамі падробка.
9. Адметнай рысай фірмовых калготак з'яўляецца прыемны пах. Кожны вытворца выкарыстоўвае свой водар, які цяжка падрабіць.
10. Мыць калготкі рэкамендуецца ўручную, тэмпература вады не павінна перавышаць 30 градусаў. Пры такім доглядзе калготкі праслужаць вам даўжэй.

*ЦАНІЦЕ СВАІХ БАЦЬКОЎ — ЯНЫ АДЗІНЫЯ, ХТО НЕ ПАКІНЕ ВАС У ЛЮБОЙ СІТУАЦЫІ (Амар Хаям).*

Адказная за выпуск Надзея ДРЫНДРОЖЫК.

# ХРАМ БЕЗ ЗВАНОЎ



Храм Святой Варвары стаіць на гары і нібы лунае ў аблоках.

## Узрывалі, палілі, рамантуюць

Лічыцца, што храм у Райцы будаваўся на ўзор царквы на востраве Святой Алены. Сапраўды, гледзячы на здымкі абодвух храмаў, можна ўбачыць супадзенні ў зубчатых вежах, курантах, падпорных элементах, аднолькавых формах вокнаў.

Падчас вайны ў алтарную частку храма трапіў снарад. А калі нямецкі снайпер з даху царквы, адкуль відаць увесь абсяг, абстрэльваў савецкія войскі, партызаны вырашылі спаліць яе. Перад гэтым мясцовым дазволілі вынесці царкоўныя рэчы, іконы і іншае начынне. Але ўсе дэкаратыўныя ўпрыгажэнні, разьба, каляровыя вітражы, фрэскі былі знішчаны агнём. Пасля храм паціху разбураўся, а ў 50-х гадах абрынуліся скляпенні. У 1959-м па загадзе мясцовых улад сцены царквы былі разбураны. З аднаго боку сцяна абвалілася да каменнага фундамента, з другога — была цалкам зруйнаваная.

У 2000-м храм пакрысе сталі аднаўляць, а ў 2003-м — пачаліся першыя набажэнствы. Праз дзесяць гадоў тут з'явіўся новы настаяцель — айцец Аляксей. У той час малады святар жыў у Навагрудку, за 26 кіламетраў ад Райцы, і на нядзельныя службы дабіраўся аўтастопам, выязджаючы ў шэсць раніцы. Так ён адслужыў год. Пасля перабраўся ў вёску за пяць кіламетраў ад Райцы і жыў у халодным доме разам з трохгадовай дачкой Сафіяй і матушкай, якая была на сёмым месяцы. Потым год сям'я святара здымала жыллё ў Карэлічах, дзе і нарадзілася малодшая дачка Ганначка. Дом у Райцы айцу Аляксею, які ўжо набыў сваё аўто, далі толькі паўтара года назад.

— Цяпер заўжды ўсіх падбіраю на трасе, бо памятаю, што такое хадзіць у маразы, — кажа ён.

Айцец Аляксей марыць калі-небудзь аднавіць храм поўнасцю, а пакуль сам косіць траву вакол, разбівае кветнікі, аформяў на сябе крэдыт на вокны для царквы, моліцца і верыць у заступніцтва святой Варвары.

## Косці ў пахавальні і падземны ход

Ацяплення ў храме не было ніколі, бо ён задумваўся перш за ўсё як радавы магільны склеп, што зроблены ў алтарнай частцы. У пахавальню звонку можна трапіць праз тры акны, якія цяпер заклалі цаглінамі, каб не лазілі дзеці і жывёлы. Існуе ўваход у склеп і знутры царквы, але яго дагэтуль не знайшлі.

— Года паўтара назад я намагаўся расчысціць склеп, аднак пакуль гэта нерэальна, бо на 70—80% ён засыпаны смеццем, а апынуцца там можна толькі праз гэтыя невялікія вокны, — расказвае айцец Аляксей. — Там мы знайшлі рэшткі фігуры Божай Маці, якая калісьці стаяла на даху храма, а сярод смецця дагэтуль знаходзім чалавечыя косці — астанкі памешчыкаў-уладальнікаў. У сценах засталіся нішы, дзе стаялі труны. Цяпер іх няма, бо ў савецкі час дзеці каталіся на іх з горкі. А ў канцы 50-х адзін са школьнікаў залез праз шчыліну ў сцяне ў склеп. Настаўнік фізкультуры, які шукаў яго, расказваў, што прайшоў па тунэлі метраў 50, перш чым знайшоў хлопчыка.

Настаяцель спадзяецца, што калі-небудзь удасца перапахаваць астанкі ў нішах, — проста яшчэ не надышоў час для гэтага.

*(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)*

## Столь на малітве і аднаўленая вежа

Самая старажытная частка храма — прытвор, які не быў разбураны. Тут засталася скляпеністая арыгінальная столь з адтулінай, праз якую наверх падымалі званы. Тады яны былі такія гучныя, што было чуваць за сем кіламетраў ад Райцы навокал. Куранты на вежы, якія некалі працавалі і нават білі бой, цяпер — муляж.

— Разбураную цэнтральную частку храма аднавілі не ў тым выглядзе, як даўней. Падлога была каменная з малюнкам у выглядзе крыжа, а не драўляная, як цяпер. Замест скляпенняў — драўляная столь, — паказвае айцец Аляксей унутранае ўбранства храма. — Нават іканастас пакуль не закончаны. Тое, што цяпер у храме, — гэта аснова. Мясцовы іканапісец піша іконы святых у поўны рост, якія ўстаўляць у нішы. Пакуль там іншыя іконы. Сам іканастас будзе ўпрыгожаны гіпсавай лепкай, паўкалонамі і іншымі дэкаратыўнымі элементамі, а наверсе з'явіцца крыж.

Дарабіць іканастас нельга, пакуль не зробяць столь. Цяпер гэта проста сайдынг, прыбіты цвікамі да кроквау і бэлек. Унутры царквы добра чуваць, як па гарышчы ходзяць галубы.

— Столь трымаецца, напэўна, на малітвах. У добры вечер яна хадуном ходзіць. Ужо і падаў кавалак — яго назад прыбілі. З гэтай жа прычыны не можам заняцца і рамонтам сцен. Калі прыхаджане пытаюцца, калі ў нас скончыцца рамонт, я суцяшаю іх і кажу, што да маёй пенсіі ён абавязкова завершыцца, а святчэннік ідзе на спакой у 75 гадоў, я так і плануюў, — і смуткуе, і жартуе айцец Аляксей. — Калі я трапіў сюды ўпершыню, храм быў велічны, але ўвесь нейкі абшарпаны звонку і знутры. Каб крыху рэабілітаваць яго, пачаў прасіць дапамогі ва ўсіх інстанцыях. Пасля таго, як зрабілі фасад і знялі рыштаванні, бачыў, як людзі спыняліся ўражаныя. Тады яны паверылі, што храм ажывае.



Каўчэг з мошчамі Святой велікамучаніцы Варвары.

Акрамя фасада ў храме адрамантавалі звaніцу, на якой працякаў дах. Штовясны талы снег сцякаў з вежы і бег па ўнутранай сцяне храма. Святар Аляксей Шышкір кажа, што з вежай вельмі дапамог старшыня мясцовага СПК "Свіцязянка" Уладзімір Галавач:

— Прыйшоў да яго параіцца, якую цэглу трэба купляць. А ён мяне ў машыну пасадзіў, на склад прывёз і пытае "стольк і хопіць"? І цэментам дапамагае, і транспартам — усё лета восьсмецце будаўнічае вывозілі.

Дах у вежы перакрылі, атынкавалі яе ўнутры, абабілі зубцы бляхай. Цяпер яна гатовая прыняць званы — пакуль службы праходзяць без іх.

— Веру, што і званы ў нас з'явяцца. А можа, гэта будуць білы — спецыяльныя пласціны, што былі на Старажытнай Русі раней за званы. У іх больш мяккі і пявучы звон. І будзем мы адзінымі ў Беларусі з біламі, а званіць у іх змогуць усе ахвотныя, — марыць настаяцель.

Двухпавярховаму будынку каля падножжа гары, на якой стаіць храм, — таксама 200 гадоў. Гэта былы прычтавы дом, дзе жыў спачатку каталіцкі служыцель, пасля — праваслаўны з сям'ёй. У 1900-х гадах тут жылі псаломшчык і дыякан. У канцы 50-х — была школа, пасля бібліятэка. Потым у памяшканні хацелі зрабіць бар ці кафэ, пры тым што літаральна за некалькі дзясяткаў метраў адсюль могілкі. Мясцовыя папрасілі вярнуць будынак царкве, і яго першы паверх перарабілі ў храм, які ў 1994 годзе асвяцілі як храм Праабражэння Гасподняга.

Спачатку на другім паверсе ніжняй царквы настаяцель хацеў зрабіць музей, аднак, калі тут пачалі рабіць рамонт, высветлілася, што ўсе бэлькі пад столлю гнілыя, падлога пад прастолам — таксама. Пачаўся капітальны рамонт: уцяпляюцца сцены, столь, заказаны новыя вокны, будзе зроблена ацяпленне.




На гэтым здымку 1910-х гадоў нашчадкі Яна Зайкі, архітэктара, які будаваў храм, пасля чаго яму далі мянушку «архітар». Гэтаксама сталі зваць яго нашчадкаў. Крайні злева (з вусамі), мяркуюць, яго сын. Лічыцца, што тут ёсць і нашчадкі ўладальніка сядзібы Францішка Дуніна-Раецкага, за кошт якога і з'явіўся храм.



Гэты кавалак старажытнай кладкі ў царкве застанецца некранутым нават пасля рамонту сцен.



Вясной, калі айцец Аляксей капаў новую клумбу, ён знайшоў пліту з родавай пахавальні Раецкіх, дзе на польскай мове напісана «светлай памяці Барбары». Тут жа царкоўныя дакументы, запоўненыя Аляксандрам Валасовічам, які даўней быў святаром храма.

— Калі скончым да зімы, будзем служыць тут, а ў верхнім храме зоймемся столлю, — спадзяецца святар.

На другім паверсе будынка ён мяркуеладзіць заняткі нядзельнай школы і ранішнікі.

## Заняткі для душы

Школу, дзе цяпер займаецца дзесяць дзетак, настаяцель стварыў два гады таму. Да халадоў вучацца ў невялікім пакойчыку пры храме, дзе ў летні час хрысціць немаўлят. А ўзімку малыя двойчы на тыдзень прыходзяць дахаты да айца Аляксея.

— Мы раскладаем пасярод пакоя вялікі стол і бывацца апынаемся ў царкоўна-прыходскай школе, — смяецца ён. — Мы малюем, лепім, рыхтуемся да канцэртаў, рэпецiруем спектаклі.

Батлеечны тэатр — таксама задума настаяцеля. Батлейку рабіў мясцовы майстар, лялек уручную шылі і распісвалі жыхары. Акцёры, якім ад 7 да 12 гадоў, самі водзяць персанажаў пад фанаграму сваіх галасоў. Яны выступаюць на ранішніках у садках, у царкве на Каляды рабілі пастаноўку для прыхаджан. На Вялікдзень падрыхтавалі ўжо два спектаклі. Айцец Аляксей стараецца рабіць так, каб ім было цікава займацца ў школе:

— Я ў дзяцінстве таксама наведваў нядзельную школу і, вяртаючыся дадому, расказваў усё, пра што даведваўся, маме. Яна гаварыла, што разам са мной вучылася і нешта запаміналa. Думаю, што цяпер і сэрцы бацькоў вучняў нашай нядзельнай школы стануць крышачку бліжэйшыя да Бога.

Яшчэ адно добрае пачынанне святара — музейны пакой, які адкрылі сёлета ў храме да яго 200-годдзя. Пакуль ён змяшчаецца перад уваходам на вежу, але з цягам часу пераедзе вышэй — на месца над уваходам у храм, дзе калісьці стаяў хор пеўчых.

У музеі сабраныя экспанаты, якія знайшоў настаяцель. Гэта старыя здымкі храма і яго ўладальнікаў, прадметы царкоўнага ўжытку: кадзільніца, малітоўнік, царкоўная пячатка, лжыца — лыжачка для прычасця, стыхар дыякана, які калісьці вёў тут службы, — адзенне ручной работы з залатой ніткай.

Адзін з экспанатаў — кавалак выгнутай цагліны, абпаленай па асаблівай тэхналогіі і такой моцнай, што яе складана разбіць нават перфаратарам па бетоне.

— Дзякуючы іх няроўнасці, калі цагліны клалі адна да адной у скляпенні, яны добра трымаліся. На некаторых захаваліся нават адбіткі пальцаў іх вытворцы, — праводзіць для мяне асабістую экскурсію настаяцель.

Ёсць тут і частка скульптуры Божай Маці — дакладней, кавалкі каменю з яе стапой і часткай рукі. Іншыя фрагменты, якія складана апазнаць, ляжаць на вуліцы, каля сцяны храма. Аднавіць фігуру ўжо немагчыма.

Калі рэстаўравалі іканастас, знайшлі каменную падлогу, невялічкі фрагмент якой, не закрыты драўлянымі дошкамі, захаваўся ў музеі. Стоячы на акуратных чырванаватых квадратах, кожны з вуглоў якіх аздоблены малюсенечкімі шэрымі ромбікамі, складана паверыць, што гэта не сучасная выява, а 200-гадовая кладка.

— Вялізныя камяні, што засталіся ў фундаменце храма, цягнулі сюды з усяго навакольля. Проста на месцы абчэсвалі, а кладку замешвалі на курыных яйках. Тая кладка жаўтаватага колеру і мацнейшая за сучасную. Фрагмент яе так і пакінем на сцяне каля музейнага пакоя пасля рамонту, — кажа святар.

## Вясёлка над храмам

1 ліпеня святая Варвара вярнулася ў свой храм — да 200-годдзя царквы па блаславенні архіепіскапа Навагрудскага і Слонімскага Гурыя сюды перадалі частку мошчаў святой. Пасля гэтага 40 дзён служылі малебны, каб выказаць ёй удзячнасць за гонар мець такую святыню. Цяпер капсула з мошчамі знаходзіцца ў спецыяльным каўчэгу, выраблены мясцовым разьбяром.

— Напярэдадні на вячэрняй службе мы маліліся святой Варвары. Ішоў лівень з сонцам, пасля якога над храмам з'явілася вясёлка. На наступны дзень, калі мошчы былі ўжо ў царкве, — таксама была вясёлка. Так што гэта асаблівая міласць для нас, — успамінае айцец Аляксей. — Цяпер прыхаджане звяртаюцца да святой з самымі надзённымі праблемамі і жыццёвымі пытаннямі, і яны здзяйсняюцца. Пасля яны прыходзяць расказаць мне пра гэта.

Святар упэўнены, што ўсімі дзівосамі храм абавязаны святой Варвары. «Гэтае месца пад яе покрывам, яна ўжо тут найпершая кіраўніца ў аднаўленні царквы, а не я», — кажа ён.

***Падрабязней пра царкву і больш здымкаў — на сайце zviazda.by.***

**Ірына СІДАРОК.** *sidarok@zviazda.by*

## Беларучский сельский исполнительный комитет сообщает о проведении 20 ноября 2017 года открытого аукциона по продаже земельных участков в частную собственность для строительства одноквартирных жилых домов

| Номер лота | Адрес земельного участка, кадастровый номер | Площадь, га | Инженерная и транспортная инфраструктура | Начальная цена, бел. руб. | Расходы по подготовке зем. документации | Сумма задатка, бел. руб. |
|---|---|---|---|---|---|---|
| **Аукцион по продаже земельных участков гражданам в частную собственность для строительства и обслуживания одноквартирного жилого дома** | | | | | | |
| 1 | Минская область, Логойский район, Беларучский с\с, д. Корбачевка, У-10, земельный участок с кадастровый номером 623280403601000072, целевое назначение земельного участка – земельный участок для строительства и обслуживания одноквартирного жилого дома | 0,1158 | Возможность подключения к электроснабжению, подъезд с грунтовой дороги | 6 000,00 | *1 527,22 + публикация в газете* | 600,00 |
| 2 | Минская область, Логойский район, Беларучский с\с, д. Дубница, земельный участок У-1, кадастровый номер 623280402601000048, целевое назначение земельного участка – земельный участок для строительства и обслуживания одноквартирного жилого дома | 0,1083 | Возможность подключения к электроснабжению, подъезд с грунтовой дороги | 4 500,00 | *1 359,78 + публикация в газете* | 450,00 |
| 3 | Минская область, Логойский район, Беларучский с\с, д. Вяча, ул. Центральная, д. 8А, земельный участок с кадастровый номером 623280402101000184, целевое назначение земельного участка – земельный участок для строительства и обслуживания одноквартирного жилого дома | 0,1296 | Возможность подключения к электроснабжению, подъезд с грунтовой дороги | 9 000,00 | *1 755,78 + публикация в газете* | 900,00 |

Задаток (10% от начальной цены) перечисляется на расчетный счет №BY97AKBB36006190111210000000 в ОАО «АСБ Беларусбанк», БИК банка AKBBBY2X, код платежа 4901, УНН 600537220 получатель – Беларучский сельский исполнительный комитет.

Аукцион состоится 20 ноября 2017 года в 10.00 по адресу: Минская обл., Логойский район, д. Алекшицы, ул. Центральная, д. 17. Заявления на участие принимаются по рабочим дням с 8.00 до 13.00, с 14.00 до 17.00 по адресу: Минская обл., Логойский район, д. Алекшицы, ул. Центральная, д. 17. Последний день приема заявлений – 14 ноября 2017 года до 17.00. Контактные телефоны: (801774) 28636,28945, 80291955545.

## Извещение о проведении 30 ноября 2017 г. аукциона по продаже в частную собственность земельного участка для строительства и обслуживания одноквартирного жилого дома в Мухавецком сельском Совете Брестского района

| № п/п. | Адрес земельного участка | Площадь, га | Начальная (стартовая) цена земельного участка | Целевое назначение земельного участка и его кадастровый номер |
|---|---|---|---|---|
| 1 | **д. Подлесье-Радваничское, ул. Московская, 42** | 0,1499 | 7 000 | строительство и обслуживание одноквартирного (блокированного) жилого дома; кадастровый номер **121283306601000215** |
| | Задаток в сумме руб. | | 700 | |
| | <u>**Затраты:**</u> за изготовление земельно- кадастровой документации с установлением границ земельного участка | | 679,33 | |
| | за государственную регистрацию земельного участка | | 69,0 | |
| | за оформление градостроительного паспорта земельного участка | | 168,10 | |
| | расходы на объявление о проведении аукциона в средствах массовой информации, руб. | | по акту выполненных работ | |

Земельный участок расположен на расстоянии до 10 км от г. Бреста в **д. Подлесье-Радваничское, ул. Московская, 42**, **Мухавецкого сельского Совета**. Подъезд к участку осуществляется по существующей дорожной сети. Участок свободен от застройки.

Аукцион будет проводиться **30.11.2017 г. в 10.00** по адресу: Брестский район, аг. Мухавец, ул. 60 лет Октября, 21 (здание сельисполкома). Для проведения аукциона необходимо наличие не менее 2 участников.

Для участия в аукционе необходимо подать заявление об участии, копию платежного поручения, подтверждающего внесение залога в размере 10% от начальной цены земельного участка на расчетный счет Мухавецкого сельисполкома: №**BY09AKBB36410000002591000000** в филиале 100 «АСБ Беларусбанк», AKBBBY21100, УНП 200087296, код платежа 04901; документ, подтверждающий личность покупателя (паспорт).

Если аукцион признан несостоявшимся из-за того, что заявление на участие в нем подано только одним гражданином, земельный участок предоставляется этому гражданину при его согласии с внесением платы за предмет аукциона в размере начальной цены предмета аукциона, увеличенной на 5 процентов.

Победитель аукциона обязан:

подписать протокол аукциона в день проведения аукциона;

в течение 10 дней со дня утверждения в установленном порядке протокола о результатах аукциона внести плату за земельный участок и возместить затраты по организации и проведению аукциона.

Заявления на участие в аукционе принимаются по адресу: **аг. Мухавец, ул. 60 лет Октября, 21**, (здание сельисполкома) **с 8.00 до 13.00 и с 14.00 до 17.00 по рабочим дням. Последний срок подачи заявлений – 24 ноября 2017 года до 17.00**.

Контактные телефоны: 94 71 35, 94 71 36, 94 74 30, 94 71 17

## Вниманию предприятий, организаций и индивидуальных предпринимателей!

Фондом «Гроднооблимущество» проводится аукцион с установлением начальной цены продажи, равной одной базовой величине, определенной законодательством по продаже неиспользуемого имущества, находящегося в собственности Волковысского района.

**К продаже предлагается:**

комплекс зданий, сооружений цеха по производству красного кирпича. Имущество расположено по адресу: г. Волковыск, ул. Осипенко, 21, 21/1-21/3, 21/8, 21/11-21/14.

Аукцион состоится 30 октября 2017 года в 11.30.

Заявки на участие в аукционе принимаются по адресу: г. Гродно, ул. 17 Сентября, 39.

Последний день подачи заявлений на участие в аукционе – 24 октября 2017 г. до 13.00.

Подробная информация по телефонам:
в городе Волковыске (01512) 4 50 25;
в городе Гродно (0152) 77 29 15, 72 25 18.

УНП 500042135

**Открытое акционерное общество «Небанковская кредитно-финансовая организация «Хоум Кредит»**

Республика Беларусь,
220018, г. Минск, ул. Одоевского, 129.
Тел.: (8017) 229 89 91,
**www.homecredit.by**

### БУХГАЛТЕРСКИЙ БАЛАНС на 1 октября 2017 года

(в тысячах белорусских рублей)

| № п/п | Наименование статьи | Символ | 01.10.2017 | 01.01.2017 |
|---|---|---|---|---|
| 1 | 2 | 3 | 4 | 5 |
| 1 | АКТИВЫ | | | |
| 2 | Денежные средства | 1101 | – | – |
| 3 | Драгоценные металлы и драгоценные камни | 1102 | – | – |
| 4 | Средства в Национальном банке | 1103 | 17 | 699 |
| 5 | Средства в банках | 1104 | 6 936 | 215 |
| 6 | Ценные бумаги | 1105 | – | 22 174 |
| 7 | Кредиты клиентам | 1106 | 8 635 | 28 161 |
| 8 | Производные финансовые активы | 1107 | – | – |
| 9 | Долгосрочные финансовые вложения | 1108 | – | – |
| 10 | Основные средства и нематериальные активы | 1109 | 1 992 | 5 076 |
| 11 | Имущество, предназначенное для продажи | 1110 | 57 | 312 |
| 12 | Отложенные налоговые активы | 1111 | – | – |
| 13 | Прочие активы | 1112 | 11 270 | 16 302 |
| 14 | ИТОГО активы | 11 | 28 907 | 72 939 |
| 15 | ОБЯЗАТЕЛЬСТВА | | | |
| 16 | Средства Национального банка | 1201 | – | 20 500 |
| 17 | Средства банков | 1202 | – | 2 |
| 18 | Средства клиентов | 1203 | 2 347 | 25 024 |
| 19 | Ценные бумаги, выпущенные банком | 1204 | – | – |
| 20 | Производные финансовые обязательства | 1205 | – | – |
| 21 | Отложенные налоговые обязательства | 1206 | – | – |
| 22 | Прочие обязательства | 1207 | 1 044 | 2 342 |
| 23 | ВСЕГО обязательства | 120 | 3 391 | 47 868 |
| 24 | СОБСТВЕННЫЙ КАПИТАЛ | | | |
| 25 | Уставный фонд | 1211 | 14 479 | 14 479 |
| 26 | Эмиссионный доход | 1212 | – | – |
| 27 | Резервный фонд | 1213 | 1 969 | 1 969 |
| 28 | Фонды переоценки статей баланса | 1214 | 168 | 190 |
| 29 | Накопленная прибыль | 1215 | 8 900 | 8 433 |
| 30 | ВСЕГО собственный капитал | 121 | 25 516 | 25 071 |
| 31 | ИТОГО обязательства и собственный капитал | 12 | 28 907 | 72 939 |

### ОТЧЕТ О ПРИБЫЛЯХ И УБЫТКАХ на 1 октября 2017 г.

(в тысячах белорусских рублей)

| № п/п | Наименование статьи | Символ | 01.10.2017 |
|---|---|---|---|
| 1 | 2 | 3 | 4 |
| 1 | Процентные доходы | 2011 | 5 402 |
| 2 | Процентные расходы | 2012 | 1 211 |
| 3 | Чистые процентные доходы | 201 | 4 191 |
| 4 | Комиссионные доходы | 2021 | 2 071 |
| 5 | Комиссионные расходы | 2022 | 380 |
| 6 | Чистые комиссионные доходы | 202 | 1 691 |
| 7 | Чистый доход по операциям с драгоценными металлами и драгоценными камнями | 203 | – |
| 8 | Чистый доход по операциям с ценными бумагами | 204 | (4) |
| 9 | Чистый доход по операциям с иностранной валютой | 205 | (85) |
| 10 | Чистый доход по операциям с производными финансовыми инструментами | 206 | – |
| 11 | Чистые отчисления в резервы | 207 | (2 807) |
| 12 | Прочие доходы | 208 | 3 326 |
| 13 | Операционные расходы | 209 | 10 120 |
| 14 | Прочие расходы | 210 | 259 |
| 15 | Прибыль (убыток) до налогообложения | 211 | 1 547 |
| 16 | Расход (доход) по налогу на прибыль | 212 | 1 102 |
| 17 | ПРИБЫЛЬ (УБЫТОК) | 2 | 445 |

Исполняющий обязанности
Председателя Правления А. В. Полищук

Главный бухгалтер А. Н. Бельник

Лицензия на осуществление банковской деятельности №18, выданная НБ РБ 15 июля 2016 года. УНП 807000056.

## ИЗВЕЩЕНИЕ О ПРОВЕДЕНИИ ЭЛЕКТРОННЫХ ТОРГОВ по продаже земельных участков в частную собственность гражданам Республики Беларусь для строительства и обслуживания одноквартирного жилого дома

**Организатор электронных торгов:** Михановичский сельский исполнительный комитет, Минский обл., Минский район. аг. Михановичи, пер. Садовый, 8, тел.: (017) 545 10 25, 503 71 67, 545 10 23, 510 62 13, тел. моб.8 (029) 165 98 22, 8 (029) 559 28 62

**Оператор электронной торговой площадки:** открытое акционерное общество «Белорусская универсальная товарная биржа».

**Электронный адрес электронной торговой площадки:** <u>www.et.butb.by</u>

Дата проведения электронных торгов: 23 ноября 2017 года

Время проведения электронных торгов устанавливается ОАО «Белорусская универсальная товарная биржа» на электронной торговой площадке «БУТБ-Имущество»

| № п/п | Адрес земельного участка | Кадастровый номер | Площадь земельного участка, *га* | Инженерная инфраструктура | Начальная цена земельного участка, *(руб.)* | Сумма задатка, *(руб.)* | Расходы по подготовке, *(руб.)* |
|---|---|---|---|---|---|---|---|
| 1 | д. Алексеевка У-94, Михановичский с/с, Минский район | 623684200101000205 | 0,1363 | Подъездные пути, электричество, газ* | 18 000,00 | 1800,00 | 1606,72 + расходы на размещение информации в СМИ и на ЭТП |
| 2 | д. Алексеевка У-95, Михановичский с/с, Минский район | 623684200101000206 | 0,1356 | Подъездные пути, электричество, газ* | 18 000,00 | 1800,00 | 1534,67 + расходы на размещение информации в СМИ и на ЭТП |
| 3 | д. Алексеевка, У-96, Михановичский с/с, Минский район | 623684200101000204 | 0,1348 | Подъездные пути, электричество, газ* | 18 000,00 | 1800,00 | 1606,72 + расходы на размещение информации в СМИ и на ЭТП |
| 4 | д. Березина, Михановичский с/с, Минский район | 623684200601000071 | 0,15 | Подъездные пути, электричество* | 14 000,00 | 1400,00 | 1072,43+ расходы на размещение информации в СМИ и на ЭТП |
| 5 | д. Березина, Михановичский с/с, Минский район | 623684200601000073 | 0,15 | Подъездные пути, электричество* | 14 000,00 | 1400,00 | 1040,62+ расходы на размещение информации в СМИ и на ЭТП |
| 6 | д. Березина, Михановичский с/с, Минский район | 623684200601000074 | 0,15 | Подъездные пути, электричество* | 14 000,00 | 1400,00 | 1001,01+ расходы на размещение информации в СМИ и на ЭТП |
| 7 | д. Гребенка, Михановичский с/с, Минский район | 623684201601000068 | 0,1488 | Подъездные пути, электричество* | 6000,00 | 600,00 | 1793,16 + расходы на размещение информации в СМИ и на ЭТП |
| 8 | д. Гребенка, Михановичский с/с, Минский район | 623684201601000071 | 0,1453 | Подъездные пути. Электричество* | 6000,00 | 600,00 | 1793,16 + расходы на размещение информации в СМИ и на ЭТП |
| 9 | д. Михановичи, У-**2**, Михановичский с/с, Минский район | 623684204101000214 | 0,0924 | Подъездные пути местного значения. Свет, газ в ближайшей перспективе* | 9000,00 | 900,00 | 1934,00 + расходы на размещение информации в СМИ и на ЭТП |
| 10 | д. Михановичи, У-**3,** Михановичский с/с, Минский район | 623684204101000216 | 0,0906 | Подъездные пути местного значения. Свет, газ в ближайшей перспективе* | 8400,00 | 840,00 | 1992,92 + расходы на размещение информации в СМИ и на ЭТП |

** в разделе «инженерная инфраструктура» указаны коммуникации, которые имеются в данном населенном пункте. Подключение к указанным коммуникациям возможно <u>только в соответствии с техническими условиями</u> на инженерно-техническое обеспечение соответствующего объекта, выдаваемыми эксплуатирующими и согласующими организациями.*

**Задаток** для участия в электронных торгах перечисляется на текущий (расчетный) счет №BY60AKBB30120000066940000000 в ОАО «АСБ Беларусбанк» в г. Минске, код AKBBBY2X, УНП 190542056, получатель платежа – ОАО «Белорусская универсальная товарная биржа». **Срок внесения задатка –** до подачи заявления на участие в электронных торгах. **Назначение платежа:** внесение суммы задатка на участие в торгах. **Окончание приема заявлений на участие в электронных торгах** с прилагаемыми к ним документами – **17 ноября 2017 года, 15.00.**

Лицо, желающее принять участие в электронных торгах в отношении нескольких предметов электронных торгов, вносит задатки в размере, установленном для каждого из этих предметов. Оплата стоимости предметов торгов осуществляется по безналичному расчету за белорусские рубли. Осмотр земельных участков на местности производится желающими самостоятельно в удобное для них время.

Электронные торги проводятся в порядке, установленном Положением о порядке проведения электронных торгов по продаже государственного имущества, включая земельные участки, права заключения договора аренды государственного имущества, в том числе земельных участков, утвержденным постановлением Совета Министров Республики Беларусь от 12.07.2013 №608 и Регламентом организации и проведения электронных торгов по продаже имущества и имущественных прав на электронной торговой площадке ОАО «Белорусская универсальная товарная биржа» от 29.12.2015 №143.

В течение десяти рабочих дней после утверждения протокола победить электронных торгов (претендент на покупку) обязан:

возместить затраты на организацию и проведение электронных торгов;

возместить расходы, связанные с формированием земельного участка и изменением земельного участка в результате такого формирования, в том числе с государственной регистрацией в отношении этого земельного участка;

выполнить условия, предусмотренные в решении об изъятии земельного и предоставлении его победителю аукциона либо единственному участнику несостоявшегося аукциона, которые подлежат выполнению до обращения за государственной регистрацией в отношении земельного участка;

внести плату (часть платы – в случае предоставления рассрочки ее внесения) за земельный участок, продаваемый в частную собственность.

После совершения победителем электронных торгов (претендентом на покупку) указанных действий, но не позднее двух рабочих дней, местный исполнительный комитет передает ему выписку из решения об изъятии земельного участка и предоставлении его победителю аукциона либо единственному участнику несостоявшегося аукциона и один экземпляр протокола.

## Изменения в проектной декларации ООО «ДАТЧ СТАР», опубликованной в газете «Звязда» 06.09.2016 г. №171

«Многоквартирный жилой дом с подземной гараж-стоянкой (№1 по генплану в квартале пр-т Держинского– ул. Щорса–ул. Железнодорожная–ул. Хмелевского) со встроенно-пристроенными объектами обслуживания населения» I очередь строительства, 6–11 секции, II очередь строительства, секции 1–3» 3–4 пусковой комплекс:

«Стоимость 1 кв. м жилого помещения для граждан, не нуждающихся в улучшении жилищных условий, на момент опубликования изменений в проектной декларации по договорам создания объекта долевого строительства составляет: 2 однокомнатные квартиры площадью от **38,48** до **46** кв. м, составляющей долларовый эквивалент от **1300** до **1400** долларов США,

**3** трехкомнатных квартир площадью от **82** до **84** кв. м, составляющей долларовый эквивалент от **1250** до **1360** долларов США. На предприятии действует система регулирования стоимости, зависимая от площади, этажа и условий оплаты строящегося жилого помещения».

Дополнительную информацию можно получить по адресу:
г. Минск, ул. 3-я Щорса, 9, офис 505.
Тел.: +375 44 53 43 000, +375 29 53 43 000

УНП 191061436



*Майстар Вераніка ГРЭБЯНЮК вяжа для дзетак і дарослых з трыкатажнай пражы.*



*На спіле дрэва стварае свае цудоўныя карціны Юлія АСТРЭЙКА.*

# ВОСЕНЬ — РАЗАМ З «МЛЫНАМ»



*У складанай тэхніцы вышыўкі стужкамі працуе майстар Тацяна ВОЙШНІС.*



**ДЭКОР і тэкстыль, посуд з керамікі і дрэва, плеценыя кошыкі і размаляваныя падносы, скураныя і тэкстыльныя заплечнікі з моднымі прынтамі, рамяні, актуальныя сумачкі з ручным роспісам, брошкі, пярсцёнкі... Усё гэта змаглі не толькі ацаніць, але і набыць наведвальнікі першай восеньскай выставы аўтарскіх вырабаў «Млын». Сёлета папулярная падзея прайшла на новым месцы — у сталічным Палацы спорту. Як заўсёды, выстава прапанавала работы некалькіх сотняў майстроў, сярод якіх кожны наведвальнік змог знайсці тое, чым упрыгожыць свой свет.**

**Марына БЕГУНКОВА, фота аўтара.**



*Майстэрня «Прыгожа дома» з драўлянымі вырабамі ад Ірыны БЕЛЬСКАЙ.*

# СЁННЯ

## Сонца

| | Усход | Захад | Даўжыня дня |
|---|---|---|---|
| Мінск — | 7.45 | 18.03 | 10.18 |
| Віцебск — | 7.37 | 17.50 | 10.13 |
| Магілёў — | 7.35 | 17.53 | 10.18 |
| Гомель — | 7.29 | 17.53 | 10.24 |
| Гродна — | 8.00 | 18.19 | 10.19 |
| Брэст — | 7.57 | 18.22 | 10.25 |

## Месяц

*Маладзік у 22.12.*
*Месяц у сузор'і Шаляў.*

## Імяніны

*Пр. Івана, Фамы.*
*К. Міхаліны, Пелагеі, Міхала, Паўла, Пятра, Яна.*



Фота Максіма ШАСТАКОВА.

# ЗАЎТРА




## Даты Падзеі Людзі

### 19 КАСТРЫЧНІКА

**1862** год — нарадзіўся Агюст Люм'ер, французскі вынаходнік, старэйшы з братоў Люм'ераў — стваральнікаў кінематографа.

**1870** год — нарадзіўся (в. Вераскава, цяпер у Навагрудскім раёне) Станіслаў Станіслававіч Трусевіч, дзеяч рэвалюцыйнага руху ў Беларусі, Польшчы і Літве, публіцыст. У 1891—1892 гадах вёў прапаганду сярод настаўнікаў і сялян Навагрудскага, Лідскага, Слуцкага паветаў. Высланы пад нагляд паліцыі ў Мінск, дзе ў 1894 годзе пад яго кіраўніцтвам была створана Мінская сацыял-дэмакратычная арганізацыя. Адзін з заснавальнікаў Рабочага саюза Літвы. За рэвалюцыйную дзейнасць неаднаразова арыштоўваўся, быў сасланы. У 1917—1918 гадах — загадчык аддзела газеты «Известия ВЦИК». Друкаваўся ў «Правде». У зборніку «Грамадскі рух у Расіі ў пачатку XX ст.» змясціў артыкул «Нацыянальны рух», у якім прывёў звесткі па гісторыі беларускай культуры, мовы і літаратуры, вітаў творчасць Ф. Багушэвіча, Я. Коласа, Я. Купалы. Аўтар брашуры «Мастацтва і пралетарыят», артыкулаў, у якіх з марксісцкіх пазіцый асвятляў ролю інтэлігенцыі ў развіцці пралетарскага руху. Памёр у 1918 годзе.

**1875** год — рускі вучоны прафесар Д. І. Мендзялееў выступіў на пасяджэнні Пецярбургскага фізічнага таварыства з праектам першага ў свеце стратасфернага аэрастата з герметычнай кабінай. Ён распрацаваў праект, намаляваў эскіз і даў поўны разлік на выраб кіраванага аэрастата.



**1890** год — нарадзіўся (г. Брагін) Сяргей Палуян, беларускі пісьменнік, публіцыст, літаратуразнавец. Адзін з пачынальнікаў беларускай прафесійнай літаратурнай крытыкі. Аўтар празаічных твораў «Вёска», вершаў у прозе «Хрыстос уваскрос» і інш. Даследаваў беларуска-украінскія літаратурныя сувязі. Выступаў за развіццё беларускай мовы і культуры. Складаў беларускую хрэстаматыю для дзяцей. Выступаў як тэатральны крытык і перакладчык. Памёр у 1910 годзе.

**1960** год — амерыканскі ўрад абвясціў аб поўнай эканамічнай блакадзе Кубы, спыніўшы ўсе аперацыі па кантрактах на пастаўку нафты новаму камуністычнаму рэжыму і экспарце цукру. Зрыў гэтых доўгатэрміновых дамоўленасцяў прынёс абодвум бакам велізарныя страты. Кожны наступны прэзідэнт ЗША дадаваў свае дэкрэты або законы па ўзмацненні жорсткасці эмбарга.

### Было сказана

**Еўдакія ЛОСЬ, паэтэса:**

*«Чалавека сляды у стагоддзях не гінуць.*
*Гэта помні заўжды,*
*Перш чым след свой пакінуць».*

## УСМІХНЕМСЯ

**Кажаце, ад ката карысці ніякай няма?**
**А хто канапу цэлы дзень ахоўвае?..**

Маці — дачцэ:
— Гэта ў мінулым стагоддзі было модна пры сварцы біць посуд.
— А цяпер, мама?
— А цяпер, дачка, старыя мабільнікі для гэтага ёсць. Ты ж хочаш, каб ён папрасіў прабачэння і купіў табе новы?

**Для добрай рыбалкі патрэбныя пяць кампанентаў: вада, рыба, рыбалоўныя снасці, рыбак і гарэлка.**
**Пры наяўнасці трох апошніх элементаў першыя два — неабавязковыя.**

Заяц-хірург робіць аперацыю цесцю. Той:
— Ты ўжо, родны, пастарайся! А то калі памру, твая цешча адразу да вас пераедзе.

**Павесіў на дзверы ЖЭКа аб'яву «Патрабуецца для работы дома добры цвярозы слесар-сантэхнік».**
**За тыдзень ніхто не патэлефанаваў...**



caricatura.ru


ЗВЯЗДА БЕЛАРУСКАЯ ГАЗЕТА

ЗАСНАВАЛЬНІКІ: Савет Рэспублікі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, Палата прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, Савет Міністраў Рэспублікі Беларусь

РЭГІСТРАЦЫЙНАЕ ПАСВЕДЧАННЕ НУМАР 2 АД 17 ЛЮТАГА 2009 ГОДА, ВЫДАДЗЕНАЕ МІНІСТЭРСТВАМ ІНФАРМАЦЫІ РЭСПУБЛІКІ БЕЛАРУСЬ.

Дырэктар — галоўны рэдактар СУХАРУКАЎ Павел Якаўлевіч.

РЭДАКЦЫЙНАЯ КАЛЕГІЯ: Н. ДРЫНДРОЖЫК, Н. КАРПЕНКА (першы намеснік галоўнага рэдактара), А. ЛЯЎКОВІЧ (першы намеснік дырэктара), М. ЛІТВІНАЎ (намеснік галоўнага рэдактара), В. МЯДЗВЕДЗЕВА (намеснік галоўнага рэдактара), А. КЛЯШЧУК, Н. РАСОЛЬКА, С. РАСОЛЬКА, А. СЛАНЕЎСКІ (намеснік галоўнага рэдактара), В. ЦЕЛЯШУК.

Выдавец — Рэдакцыйна-выдавецкая ўстанова «Выдавецкі дом «Звязда».

НАШ АДРАС: 220013 г. Мінск, вул. Б. Хмяльніцкага, 10-а.

ТЭЛЕФОНЫ Ў МІНСКУ: прыёмнай – 287 19 19 (тэл./факс); аддзелаў: пісьмаў — 287 18 64, маркетынгу — 337 44 04, бухгалтэрыі: 287 18 81.

Аўтары апублікаваных матэрыялаў нясуць адказнасць за падбор і дакладнасць фактаў. Іх меркаванні не заўсёды супадаюць з меркаваннем рэдакцыі. Рэдакцыя па сваім меркаванні адбірае і публікуе адрасаваныя ёй пісьмы. Перадрук матэрыялаў, апублікаваных у «Звяздзе», толькі з дазволу рэдакцыі.

http://www.zviazda.by;
e-mail: info@zviazda.by,
(для зваротаў): zvarot@zviazda.by

ПРЫЁМ РЭКЛАМЫ тэл./факс: 287 17 79, e-mail: reklama@zviazda.by

Матэрыялы, пазначаныя гэтым значком, носяць рэкламны характар. Адказнасць за змест рэкламы нясуць рэкламадаўцы.

Газета аддрукавана ў Рэспубліканскім унітарным прадпрыемстве «Выдавецтва «Беларускі Дом друку». ЛП № 02330/106 ад 30.04.2004. 220013, Мінск, пр. Незалежнасці, 79. Выходзіць 5 разоў на тыдзень.

Тыраж 20.008. Індэкс 63850. Зак. № 3898.

Нумар падпісаны ў 19.30 18 кастрычніка 2017 года.

М 1 2 3 4 5 6 7 8 9 10 11 12
П 1 2 3 4 5 6 7 8 9 10 11 12